

КАРА ДЛЯ КАРНІКА ХАТЫНІ

3

МОЖАШ — ДАПАМАЖЫ... АЛЬБО НЕ АБЯЦАЙ

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 САКАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 56 (30190)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- З'езд БРСМ па выбранні дэлегатаў УНС пройдзе 9 красавіка.
- **Рэспубліканская акцыя «Адновім лясы разам!» пройдзе з 23 сакавіка да 20 красавіка.**
- Больш за 2,5 тысячы чалавек наведалі мемарыял у Азарычах за тры месяцы пасля яго рэканструкцыі.
- **У Беларусі за апошнія 10 гадоў узровень захворвання на туберкулёз знізіўся больш як у тры разы.**
- Больш за 200 платформ для гнездавання буслоў усталююць беларускія энергетыкі.
- **Рэспубліканскі музычны фестываль «Львяня» збярэ ў Лідзе каля дзвюх тысяч юных выканаўцаў.**
- Беларусь і Турцыя дамовіліся аб прадаўжэнні нарошчвання турпатокаў паміж краінамі.
- **Першы авіярэйс з Мінска на кітайскі востраў Хайнань запланаваны на 25 мая.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Важны накірунак — развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Фізічным асобам неабходна даць магчымасць пакупкі гатовага індывідуальнага жылля замест самастойнага будаўніцтва, якое часта расцягваецца на доўгія гады, а потым жыллё яшчэ і не ўводзіцца ў эксплуатацыю па розных прычынах. Трэба аднавіць такое паняцце, як дзяржаўны заказ у будаўніцтве жылля. Меры для гэтага ў бягучым годзе ўжо прымаюцца».*

З першых вуснаў

# «ВЫ — НАШЫ ЛЮДЗІ. МЫ ВАС БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ТУТ, У БЕЛАРУСІ»

## Касмічная гісторыя незалежнай краіны пачынаецца

**Космас цяпер і беларускі — афіцыйна: на 21 сакавіка на 16 гадзін 21 хвіліну па маскоўскім часе запланаваны старт касмічнага карабля «Саюз МС-25». Палёт да міжнароднай касмічнай станцыі прадугледжваецца па двухвітковай схеме, стыкоўка з МКС — праз тры гадзіны пасля старту. Экіпаж 21-й экспедыцыі на Міжнародную касмічную станцыю — асаблівы. З трох чалавек у ім два — з Беларусі. Упершыню ў гісторыі на гэтым караблі ў космас адправіцца беларуская жанчына Марына Васілеўская. А камандзір экіпажа — лётчык-касманаўт Расійскай Федэрацыі Алег Навіцкі, ураджэнец беларускага Чэрвеня. Таксама ў склад экіпажа ўваходзіць астранаўт NASA Трэйсі Дайсан.**



Фота БелТА

Цяпер касманаўты праводзяць перадстартавую падрыхтоўку на касмадроме Байканур у Казахстане. Алег Навіцкі здзейсніў палёты ў космас у 2012, 2016 і 2021 гадах, агульная працягласць палёту — 531 суткі і 22 гадзіны ў адкрытым космасе. Марына Васілеўская таксама звыклая да палётаў: з 2017 да 2023 года яна працавала бортправадніком авіякампаніі «Белавія». У 2022 годзе прайшла нацыянальны адбор, праверку галоўнай медыцынскай камісіі Навукова-даследчага выпрабавальнага цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына і была вызначана асноўным удзельнікам палёту да МКС ад Беларусі.

Напярэдадні старту экспедыцыі з касманаўтамі па відэа-канферэнц-сувязі сустрэўся Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Адлегласць не перашкодзіла цёплай і па-сапраўднаму сяброўскай размове. Кіраўнік дзяржавы, які стаяў каля вытокаў гэтага гістарычнага праекта, цікавіўся ўсім, што звязана з экспедыцыяй.

### «МНЕ ХАЦЕЛАСЯ Б, КАБ ВЫ ТАМ ДРУЖНЫМІ БЫЛІ ЛЮДЗЬМІ»

Першае пытанне ад Прэзідэнта да камандзіра экіпажа — пра самаадчуванне яго і галоўнай гераіні, Марыны Васілеўскай. «Стан галоўнай гераіні вельмі баявы. Спакойная, нацэленая на работу, на выкананне праектаў у цэлым. Вялікі дзякуй, што выбар паў менавіта на Марыну», — адказаў Алег Навіцкі.

СТАР. 2

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Жывіце ўбяспецы!

# АД БЕСКАНТРОЛЬНАСЦІ ДА БЯДЫ — АДЗІН КРОК

## Што рабіць, калі згубіліся дзеці, і як прадугледзець іншыя небяспечныя сітуацыі з непаўналетнімі?



Выратаваны хлопчык, які па пояс знаходзіўся ў гразі.

**На мінулым тыдні беларусы былі ўзбударажаны навіной — у вёсцы Рыбцы Пухавіцкага раёна згубіліся дзеці. Двухгадовая і чатырохгадовая сястрычкі выйшлі ад бабулі і не дайшлі дадому... У пошуках малых дзяцей удзельнічала звыш 600 чалавек, было задзейнічана больш як 50 адзінак тэхнікі. Ноччу іх знайшлі ў лясным масіве за некалькі кіламетраў ад хаты. З папярэднім дыягназам — агульнае пераахаладжэнне — яны былі шпіталізаваны ва ўстанову аховы здароўя. Жыццю дзяўчынак, на шчасце, нічога не пагражае.**

СТАР. 4

Суайчыннікі

# Ліванскі сябар віцебскіх рагуль

**Усе жывёлы любяць ласку і пяшчоту — у гэтым перакананы ветэрынарны ўрач з Лівана Халіл БАЛУТ, які ўжо некалькі гадоў асвойвае прафесію ў Віцебскім раёне. Каровы, якіх у яго сям'і на далёкай радзіме некалькі дзясяткаў, з'яўляюцца для маладога чалавека не толькі падапечнымі, але і сябрамі з разумным чалавечым позіркам.**



СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

24056

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2024 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «ВЫ — НАШЫ ЛЮДЗІ. МЫ ВАС БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ТУТ, У БЕЛАРУСІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка, жартуючы, даручыў Алегу Навіцкаму сачыць, каб Марыну ў свой сегмент Міжнароднай касмічнай станцыі не выкралі амерыканцы. «Яна будзе заходзіць толькі разам з камандзірам і выходзіць са мной жа», — адказаў Алег Навіцкі. «Я цябе вельмі папрашу, паглядзі. Яна ж нам патрэбна на Зямлі потым», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. «Канешне, вернем у цэласці і захаванасці», — паабяцаў Алег Навіцкі.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся самаадчуваннем у самой Марыны Васілеўскай, яе настроем, гатоўнасцю, хваляваннямі. «Вядома, перажыванні, невялікае хваляванне прысутнічае. Паколькі я дзяўчына і ўсё гэта ўпершыню. Але ў мяне вельмі дасведчаны надзейны камандзір, мяне падтрымліваюць інструктары, выкладчыкі, мой кіраўнік Іван Мікалаевіч Буча (намеснік начальніка ўпраўлення аэракасмічнай дзейнасці НАН Беларусі. — **«Зв.»**), мой экіпаж. У нас вельмі добрыя, зладжаныя, сяброўскія адносіны ў экіпажы. Гэта мяне падтрымлівае, — прызналася Марына. — Я буду рабіць усё магчымае, каб выканаць задачы, якія на мяне ўскладзены».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў маладой касманаўткі ёсць добры прыклад у асобе Алега Навіцкага. Ён параіў Марыне трымацца бліжэй да яго. «Мне хацелася б, каб вы там дружнымі былі людзьмі. Усё ж такі край у вас адзін, карані вашы... Мы будзем вельмі хвалявацца за вас і спадзявацца, што пасля вяртання я ўбачу вас тут», — сказаў Прэзідэнт. Ён згадаў, як разам з Алегам Навіцкім гатавалі салату «Маладосць», паабяцаў пачаставаць гэтай салатай і Марыну Васілеўскую пасля вяртання экіпажа. «Тым больш у яе ж хобі. Першы раз бачу дзяўчыну, якая можа прыгатаваць і любіць гатаваць. Мы яе навучым гатаваць нашу салату», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На тым і дамовіліся.

## «ХАЦЕЎ БЫ, КАБ ПАЛЯЦЕЛІ ЎТРАІХ: АЛЕГ, МАРЫНА І НАСЦЯ»

Беларускага лідара цікавілі ўсе моманты хуткай экспедыцыі. Ён удакладніў у Алега Навіцкага, ці вяртаецца ён разам з Марынай або застаецца на МКС. Касманаўт адказаў, што з Марынай яны разам вернуцца на зямлю, а на МКС застаецца трэці член іх экіпажа амерыканка Трэйсі Дайсан. «То-бок у цябе палёт будзе самы кароткі ў жыцці», — удакладніў Прэзідэнт. «Самы кароткі, але, мабыць, самы прыемны: увесь час у акружэнні жанчын», — адказаў Алег Навіцкі. «Значыць, ёсць надзея, што ў хуткім часе сустрэнемся ў поўным саставе», — адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы запытаў, на якой мове Алег і Марына размаўляюць са сваёй спадарожніцай — амерыканкай Трэйсі Дайсан. Па словах касманаўтаў, на сумесі рускай і англійскай моў, і няма складанасцяў у зносінах. «Яна ведае рускую мову, як мы — англійскую. Калі тэхнічная мова, нашмат прасцей паразумецца. Спадзяюся, за 12 дзён сумеснага палёту мы яе нейкім беларускім выразам навучым усё ж такі», — заўважыў Алег Навіцкі.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў не губляць Настассю Лянкову, дублёра. «Сустрэнемся — пагаворым пра яе перспектывы. Яе ж рыхтавалі так як і Марыну, таму чалавека таксама нам страціць нельга», — падкрэсліў ён. «Не страцім», — запэўніў касманаўт.

Падчас касмічнага палёту на МКС будзе выканана навуковая праграма, распрацаваная НАН Беларусі сумесна з Дзяржкарпарацыяй «Раскосмас». Навуковыя даследаванні будуць выкананы ў галіне біялогіі, фізіялогіі, аўтаномнага функцыянавання касмічных станцый, дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з выкарыстаннем фота- і відэаспектральнай апаратуры беларускай вытворчасці, якая знаходзіцца на МКС. Будуць даследаваны таксама лактаферын і прабіётыкі, выробленыя навуковымі арганізацыямі НАН, для іх наступнага магчымага выкарыстання ў стварэнні прадуктаў харчавання для касманаўтаў. Але для Аляксандра Лукашэнкі на першым месцы — здароўе касманаўтаў.

«Марына, ты там не моцна напружвайся са сваімі эксперыментамі. Што не зробіце ў космасе — на Зямлі даробім. Наступны раз паляцім — даробім. Каб усё было добра. Мы за вас вельмі перажываем тут», — параіў Марыне кіраўнік дзяржавы.

«Дзякуй. Я са свайго боку буду старацца выканаць усю праграму. Буду не спаць, але выканаю ўсё», — адказала Марына.

«Не напружвайся. І спі, і адпачывай. Ты павінна ўсё адчуць. Ты павінна ведаць усё, бо людзі ў цябе будуць пытацца», — настойвае беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што мае намер звярнуцца да расійскага боку з тым, каб у будучыні арганізаваць касмічны палёт усіх трох чалавек, якія рыхтаваліся да цяперашняй экспедыцыі, — камандзіра Алега Навіцкага, Марыны Васілеўскай і Анастасіі Лянковай. «Калі будзеш сябе добра адчуваць, то буду прасіць расіян, каб утрох паляцелі ўжо — Насця, Марына і ты», — сказаў ён, звяртаючыся да Алега Навіцкага.

«Добра, з задавальненнем, — адказаў на гэта касманаўт. — Выканаем задачу любую».

«Я тады пры сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі якраз ужо пацяну буду закідваць гэтыя пытанні», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

## «НАШЫ ДЗЯЎЧАТЫ ПРАГРАМУ ЗАСВОІЛІ ЛЁГКА»

У сваю чаргу Алег Навіцкі звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з просьбай абмеркаваць пытанне наконт таго, каб даць беларусам магчымасць не як іншаземцам, не як турыстам, а як прафесіяналам удзельнічаць у падрыхтоўцы да касмічных палётаў. «Як касманаўтаў расіяне рыхтуюць — каб і беларусаў так рыхтавалі, так? Гэта не пытанне, яны пагодзяцца. А што дрэннага? Нічога дрэннага. Я ўпэўнены, што нашы дзяўчаты (я па водгуках ведаю, цікаўлюся гэтым пытаннем) ім вельмі спадабаліся ў плане падрыхтоўкі — вельмі адказныя і праграму падрыхтоўкі засвоілі лёгка», — адказаў Прэзідэнт. Ён паабяцаў, што абмяркуе гэта пытанне з расійскім бокам, і выказаў упэўненасць, што ініцыятыва будзе падтрымана.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што на падобныя праекты будуць патрэбны грошы. Але тут ёсць паразуменне з расійскім бокам, паколькі краіны шчыльна супрацоўнічаюць у касмічнай сферы. «Пуцін наконт гэтага малайчына. Яны не шкадуюць грошай дзеля таго, каб нас падтрымаць як касмічную дзяржаву. Мы з імі разлічымся па іншых кірунках. У нас прадпрыемствы магутнае ёсць, якое выраблае спадарожнікі, у тым ліку ў інтарэсах Расіі», — сказаў Прэзідэнт.

Цяпер беларускія спецыялісты працуюць над стварэннем спадарожніка з высокім раздзяленнем. І, па словах Прэзідэнта, прасунуліся наперад у гэтым плане. «Калі санкцыі ўвялі, думалі, што мы рухнем. А аказалася, што мы запатрабаваны, асабліва ў касмічнай галіне Расійскай Федэрацыі. Цяпер запатрабаванасць вельмі высокая з боку касмічнага сегмента эканомікі Расійскай Федэрацыі», — сказаў ён.

Асаблівую падзяку за гатоўнасць развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю Прэзідэнт выказаў дырэктару дзяржкарпарацыі «Раскосмас» Юрыю Барысаву: «Ён проста малайчына. Ён адгукнуўся на ўсе мае просьбы. Вельмі прыстойны чалавек».

## «ГАЛОЎНАЕ, КАБ У ВАС БЫЛО ЖАДАННЕ ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў беларусаў і расіян вялікія перспектывы ў супрацоўніцтве па касмічных палётах. «Галоўнае, каб у вас жаданне было працаваць разам», — звярнуўся ён да касманаўтаў. Яны запэўнілі, што жаданне ёсць.

«Карацей, праблем ніякіх няма», — удакладніў Прэзідэнт. Камандзір экіпажа запэўніў, што праблем няма, усё ідзе штатна, згодна з планам падрыхтоўкі.

«Мы будзем рады, калі ўсё будзе штатна, нармальна. Будзем вельмі-вельмі вас чакаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Яшчэ раз хачу падзякаваць за высокі гонар для мяне прадстаўляць сваю краіну на МКС падчас адказнай і неверагодна цікавай місіі», — сказала Марына Васілеўская.

«Дзякуй вялікі вам. Выбачайце, што вас адарваў у гэтыя адказныя моманты. Але хоць крышку адцягнуў вас ад гэтай махіны (ракеты. — **«Зв.»**), якую мы назіралі, — вывозілі на старт. Таксама трэба нейкая разгрузка. Вы павінны ведаць, што вы — нашы людзі. Мы вас будзем чакаць тут, у Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы гэта ведаем, Аляксандр Рыгоравіч. І таму ўпэўненасць у паспяховым выкананні ўсяго праекта пастаянна высокая. Вялікі дзякуй за падтрымку ўсяго экіпажа ў цэлым», — сказаў Алег Навіцкі.

На развітанне Прэзідэнт дадаў: «Дзякуй вам. Да сустрэчы! Марына, ты не хвалюйся. Глядзі на Алега».

«Так, мяне камандзір вельмі падтрымлівае, праўда. Таму я стойкая духам, гатова да палёту. Усё будзе добра. З Божай дапамогай», — адказала Марына Васілеўская.

«Дзякуй. Вы там будзеце блізка. Калі што, перадавайце прывітанне. Я Яго таксама прасіў, каб Ён вас там сустрэў добра. Поспехаў, усяго добрага», — завяршыў сустрэчу Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ Дарэчы

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 19 сакавіка падпісаў Указ № 100 «Аб статусе беларускага касманаўта», які замацоўвае правы і абавязкі касманаўта Рэспублікі Беларусь. Дакумент прыняты ў мэтах вызначэння прававога становішча касманаўтаў і прыраўнаваных да іх асоб з улікам рэалізацыі першага ў суверэннай гісторыі Беларусі праекта па касмічным палёце, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Устаноўлена, што статус касманаўта надаецца грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які здзейсніў касмічны палёт, а таксама яго дублёру.

У мэтах прызнання заслуг касманаўта перад Радзімай указам прадугледжаны шэраг ільгот і прэферэнцый, уключаючы захаванне займанай пасады, медыцынскае абслугоўванне ў Рэспубліканскім клінічным медыцынскім цэнтры, пенсіённае забеспячэнне, дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве жылля.

Пры гэтым вызначана, што касманаўт павінен адпавядаць свайму высокаму званню, валодаць цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй, прымаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны, дастойна прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне.

Рэалізацыя ўказа будзе садзейнічаць замацаванню пазітыўнага іміджу Беларусі як высокатэхналагічнай дзяржавы, прапагандзе ведаў і кампетэнцый краіны ў галіне мірнага асваення касмічнай прасторы.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Найбуйнейшую ваенную базу НАТА ў Еўропе пабудуюць у Румыніі



Пачаліся работы па пашырэнні 57-й авіябазы ВПС Румыніі «Міхаіл Кагэлнічану», у выніку чаго ў краіне з'явіцца самая вялікая ваенная база НАТА ў Еўропе. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал TVR Info. Паводле даных тэлеканала, Румынія інвестуе ў праект 2,5 мільярда долараў. Адзначаецца, што плошча новага ваеннага комплексу, які з'явіцца ў выніку пашырэння базы «Міхаіл Кагэлнічану», будзе складаць 2,8 тысячы гектараў. Пры гэтым праект прадугледжвае пашырэнне інфраструктуры аэрадрома, уключаючы ўзлётна-пасадачныя палосы, новую дыспетчарскую вышку, сістэму радыёмаяка і радыёнавігацыі, ангары. Таксама тут будуць размешчаны адміністрацыйныя і сацыяльныя аб'екты, школы, дзіцячыя садкі, магазіны, кінатэатр, бальніца. Плануецца, што ў горадзе будуць жыць каля 10 тысяч салдат НАТА з сем'ямі і дапаможным персаналам базы. Работы праводзяцца ўжо ў паўднёвай частцы комплексу, дзе будуюць пад'язныя дарогі і электрасетку. Як чакаецца, база будзе поўнасцю ўведзена ў эксплуатацыю да 2040 года.

### Аб'ём імпарту золата ў Індыю ўзрос больш чым удвая

Індыя ў мінулым месяцы імпартавала золата на 6,15 мільярда долараў, адзначаецца ў матэрыялах Міністэрства гандлю і прамысловасці краіны. Гэта ў 2,3 раза больш, чым у лютым мінулага года, у 3,2 раза перавышае паказчык сёлетняга студзеня і ў цэлым прыкладна ўдвая больш традыцыйных сярэднямесячных узроўняў. Пры гэтым, прагназуе прэзідэнт India Bullion and Jewellers Association Прытхвірадж Катары, у сакавіку імпарт можа аказацца нязначным з-за рэкордна высокіх цэн на золата. «Спажыўцы не могуць прыняць бягучы ўзровень цэн. Калі цэны застануцца такімі ж высокімі, гэта паўплывае на попыт у бягучым вясельным сезоне, — заявіў ён Reuters. — Банкам і афінажным прадпрыемствам няма сэнсу імпартаваць». Усяго ў студзені — лютым імпарт золата ў Індыю склаў $8,06 мільярда, што ў 2,4 раза больш за вынік адпаведнага перыяду мінулага года. Па выніках 2023 года Індыя імпартавала амаль 744 тоны золата на $42,58 мільярда. У натуральным выражэнні аб'ём вырас на 4 %, у вартасным — на 16 %. Індыя з'яўляецца адным з найбуйнейшых спажыўцоў золата ў свеце, але амаль не выраблае яго сама.

### У Лондане з'явіўся новы твор Бэнксі



У брытанскай сталіцы з'явіўся новы твор сусветна вядомага вулічнага мастака Бэнксі, паведаміў Euronews. На сцяне аднаго з будынкаў у Хорнсі-роўд у раёне парку Фінсберы, што на поўначы брытанскай сталіцы, мінакі знайшлі графіці. Гэта выява чалавека са шлангам у руцэ і балонам-распыляльнікам. Вакол яго ўсё афарбавана ў зялёны. Мазкі пры гэтым нагадваюць лістоту, якой не хапае дрэву, што стаіць насупраць, — яго галіны спілаваны. Сам ананімны мастак ужо пацвердзіў сваё аўтарства, апублікаваўшы два фота сцяны, — да таго, як ён прыступіў да работы, і калі яна ўжо была завершана. З фасада дома, якому відавочна патрабуецца рамонт, абласціць фарба, так што фрэска ўжо хутка можа страціць свой першапачатковы выгляд.

Гучная справа

# ПАКАРАННЕ БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

## Эксперты — аб прыгаворы Вярхоўнага Суда па справе ката Хатыні Уладзіміра Катрука

**Украінскі нацыяналіст, баец 118-га батальёна ахоўнай паліцыі прызнаны вінаватым у здзяйсненні генацыду (артыкул 127 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь). Як і многія злачынцы, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны забівалі мірнае насельніцтва Беларусі, Катрук не панёс пакарання. Не панясе ён яго і зараз, бо на працягу многіх дзесяцігоддзяў хаваўся ад правасуддзя ў Канадзе, дзе спакойна дажыў да глыбокай старасці і пайшоў з жыцця. Аднак нават пасля яго смерці справядлівасць устаноўлена.**

Згодна з абноўленым Крымінальна-працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, устаноўлена непазбежнасць адказнасці за генацыд. Заканадаўствам прадугледжана недапушчальнасць адмовы ва ўзбуджэнні крымінальнай справы і спыненні вытворчасці ў дачыненні да памерлых асоб, якія ўчынілі злачынствы, што не маюць тэрміну даўнасці. Уведзены прававыя механізмы, якія дазваляюць правесці судовы разбор па крымінальнай справе ў дачыненні да памерлага абвінавачанага, што дае магчымасць забяспечыць не толькі прынцып непазбежнасці адказнасці за зробленае, але і аднавіць гістарычную справядлівасць у адносінах да нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

### Дзеля захавання памяці і аднаўлення гістарычнай справядлівасці

Што вядома аб злачынцы Катруку? Пераследуючы мэту знішчэння беларускага народа, кіруючыся матывамі нацыянальнай і ідэалагічнай варожасці на глебе нянавісці да дзяржаўнай ідэалогіі СССР, восенню 1941 года ён добраахвотна ўступіў у арганізацыю ўкраінскіх нацыяналістаў, а затым (не пазней студзеня 1943 года) увайшоў у склад узброенай арганізаванай злачыннай групы — 118-га батальёна ахоўнай паліцыі. З'яўляючыся камандзірам аддзялення, сумесна з іншымі карнікамі, Катрук рэалізоўваў агульную з нацысцкімі злачынцамі мэту планамернага знішчэння беларускага народа шляхам забойстваў, пазбаўлення людзей жылля, адзення і прадуктаў харчавання. За што канкрэтна яму прызначана пакаранне, было агучана ў судзе.

Як адзначаў падчас судовых спрэчак **дзяржаўны абвінаваўца — намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК**, такі судовы працэс у гісторыі беларускага правасуддзя праходзіў упершыню. Яго значэнне — у захаванні памяці аб подзвігу і ахвярах беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўленні гістарычнай справядлівасці і забеспячэнні прынцыпу непазбежнасці пакарання.

«Маштабы палітыкі генацыду, разгорнутай нацысцкай Германіяй і яе памагатымі ў адносінах да насельніцтва Беларусі, а таксама іншых савецкіх народаў з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны, не мелі прэцэдэнту ў сусветнай гісторыі, і гэты факт бясспрэчны, — падкрэсліў дзяржаўны абвінаваўца. — Акупацыя БССР працягвалася 1133 дні, і кожны з гэтых дзён нацысты і іх памагатыя знішчалі ні ў чым не вінаватых мірных грамадзян і ваеннапалонных, знішчыўшы каля трох мільёнаў жыхароў Беларусі. Кожны з гэтых дзён стаў трагічнай і адначасова гераічнай старонкай барацьбы беларускага народа».

Аляксей Стук падкрэсліў: вынікі расследавання і судовага разгляду крымінальнай справы дазваляюць сцвярджаць: тое, што зрабілі нацысты на беларускай зямлі ў гады вайны, з'яўляецца сапраўдным генацыдам, цынічна спланаваным задоўга да рэальнага ўварвання на тэрыторыю Беларусі. Мэта, якую пераследвалі нацысты, заўсёды была адной — татальнае знішчэнне беларускага народа.

### Памяць аб мінулым — клопат аб будучыні

Каментуючы прысуд кату Хатыні Катруку, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія АНАНІЧ** адзначае: нягледзячы на тое, што сам кат пры жыцці змог пазбегнуць адплаты, у злачынстваў супраць чалавецтва няма тэрміну даўнасці. «Не вярнуць з вечнасці загубленыя нацыстамі і іх памагатымі мільёны жыццяў нявінных людзей, не забудзе неба праклёны ў адрас карнікаў ад маці, на вачах якіх курчыліся ў перадсмяротных пакутах немаўляты, не зарасце ніколі народная сцежка да велічных мемарыялаў, не стануць ніколі ў Беларусі героямі памагатыя нацыстаў, — падкрэслівае дэпутат. — І абвінаваўчы прысуд дастане Катрука — на тым свеце»...

Лілія Ананіч звяртае ўвагу на тое, што, памятаючы аб мінулым, мы клапоцімся аб будучыні. «Асабліва ў цяперашні час, калі зусім нямшат ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны яшчэ сярод нас, пакаленне пераможцаў павінна ведаць: наша памяць святая, — удакладняе парламентарый. — Наш абавязак — засцерагчы ад бяспамяцтва будучыя пакаленні, якія пра Вялікую Айчынную вайну будуць даведвацца па кнігах і кінафільмах, па справах нас, сённяшніх, якія ў тым ліку і на заканадаўчым узроўні паставілі заслон фашызму і далі справядлівую ацэнку злачынствам нацыстаў на беларускай зямлі. Ніхто не забыты! І нішто не забыта!»

### «Трэба шукаць новыя дакументы»

Як лічыць **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ**, такія працэсы над забойцамі мірных жыхароў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны патрэбны. «Аднак, на мой погляд, яны павінны быць яшчэ больш дакументаванымі, — канкрэтызуе ён. — Трэба шукаць новыя дакументы, тым больш сёння з'явілася ўнікальная магчымасць працаваць з дакументамі праціўніка, а гэта каштоўная інфармацыя. Адных партызанскіх дакументаў для пацвярджэння злачынстваў недастаткова. Пры гэтым неабавязкова выязджаць за межы краіны: яны даступныя ў алічбаваным выглядзе. Дзякуючы сучасным тэхналогіям супрацоўнікі Нацыянальнага архіва знаходзяць у Германіі і ЗША ўнікальныя даныя. Напрыклад, абапіраючыся ў тым ліку на новыя дакументы, мы дапоўнілі спіс спаленых у гады акупацыі населеных пунктаў Беларусі».

Па меркаванні гісторыка, варта судзіць і камандзіраў 118-га батальёна. «Ні Смоўскага, ні Кёрнера ніколі не судзілі, увогуле нават не казалі аб іх злачынствах, — заўважае ён. — Смоўскі спакойна пражыў за мяжой, атрымаў павышэнне, даслужыўся ледзь не да генерала. А як склаўся лёс Кёрнера? Варта арганізоўваць судовы працэс над усім 118-м батальёнам, тады гэта прагучыць яшчэ больш моцна».

### «За генацыд адкажуць усе: жывыя ці мёртвыя»

Як сцвярджае **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ірына ДАЎГАЛА**, кожны павінен адказаць перад законам, пры гэтым няважна, жывы ён ці мёртвы. «Калі ідзе гаворка аб захаванні нацыі, а гэта не пафас — гэта рэаліі, то дзяржава павінна прыняць усе меры, каб тыя, хто быў актыўным удзельнікам, памагатым, саўдзельнікам злачынства, былі прыцягнуты да адказнасці, — тлумачыць дэпутат. — У дадзеным выпадку не мае значэння, жывы гэты чалавек або пайшоў у іншы свет. Важна, каб людзі, грамадзяне нашай краіны, ведалі і памяталі, што менавіта гэтыя злачынцы забівалі і спальвалі, вешалі і білі штыкамі, збівалі да смерці, мучылі ў газавых камерах нашых родных і блізкіх, тых, хто абараняў сваю Радзіму, сваю зямлю. Гэтыя злачынцы не шкадавалі нікога: ні старых, ні жанчын, ні нават немаўлят, спальвалі тысячамі, жывымі закопвалі ў зямлю».

Ірына Даўгала нагадвае, што, калі прымаўся Закон «Аб генацыдзе беларускага народа», у асобным артыкуле было даручэнне Генеральнай пракуратуры прыняць дадатковыя меры па ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным расследаванні акалічнасцяў генацыду беларускага народа. Даручэнне датычылася і ўстанаўлення асоб, якія маюць дачыненне да ўчынення генацыду, прыцягнення іх да крымінальнай адказнасці. Гэта і было выканана. У чэрвені мінулага года, дадае дэпутат, парламентам былі прыняты змяненні ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць вядзенне па крымінальных справах аб генацыдзе беларускага народа ў дачыненні да памерлых асоб незалежна ад згоды іх сваякоў.

Кажучы аб каце Катруку, Ірына Даўгала наўмысна не называе яго імя. «Яго падраздзяленні 22 сакавіка 1943 года ўдзельнічалі ў забойстве жыхароў вёскі Хатынь, па сведчанні відавочцаў, Катрук дабіваў параненых жыхароў вёскі Казыры і расстрэльваў хатынцаў, якія спрабавалі выбрацца з палаючага хлява, — канстатуе яна. — Крыўдна, што Катрука не ўдалося раней прыцягнуць да адказнасці, бо яго экстрадыцыі патрабаваў яшчэ кіраўнік Міністэрства замежных спраў СССР Андрэй Андрэевіч Грамыка, але Канада не выдала яго, матывавалы гэта тым, што Катрук не быў грамадзянінам Савецкага Саюза. Аднак цяпер па нашым беларускім заканадаўстве крымінальная справа расследавана. І прысуд вынесены. Даказана віна ў поўным аб'ёме».

Дэпутат лічыць сімвалічным, што разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да Катрука завершаны напярэдадні дня, калі фашысцкія карнікі спалілі Хатынь. «Важна памятаць усім — і для гэтага не трэба быць юрыстам, — што злачынствы супраць міру і генацыду беларускага народа тэрміну даўнасці не маюць, адкажуць усе: жывыя ці мёртвыя», — рэзюмуе парламентарый.

У найбліжэйшы час у суды краіны будуць накіраваны іншыя справы такой катэгорыі. Не ўсе калабарацыяністы, нацысты, карнікі былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці пры жыцці. Яны знайшлі прытулак у некаторых заходніх краінах, дзе, пазбегнуўшы правасуддзя, шчасліва дажылі да старасці. Але, дзякуючы абноўленаму заканадаўству Беларусі, злачынцы, якія вінаватыя ў гібелі нашых землякоў, панясуць пакаранне. Нават пасля сваёй смерці.

**Вераніка КАНЮТА.**

Паводка

# «ВОДНАЕ ТАКСІ» Ў ГОМЕЛІ

**У горадзе над Сожам вялікая вада пачала патроху здаваць пазіцыі. За суткі яе ўзровень у рацэ ў раёне горада ўпаў на пяць сантыметраў і цяпер складае пяць метраў. Між тым з-за паводкі даволі напружанай застаецца сітуацыя ў раёне вуліцы Палявой, што ў прыватным сектары Якубоўкі Навабеліцкага раёна Гомеля. Вада з поймы Сажа тут перамясцілася на агароды, падворкі, у дамы. Падтоплена і частка дарогі. Для бяспекі руху людзей арганізаваны мабільны пост ратавальнікаў з плаўсродкамі, ажыццяўляецца перавозка грамадзян па вуліцы.**

Дапамога такога «воднага таксі» на гэтым участку Гомеля — асабліва важная і папулярная сярод мясцовых школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў. У самым глыбокім месцы падтопленага ўчастку дарогі — амаль паўтара метра. Па вуліцы можна прайсці ў высокіх рыбацкіх ботах ці скарыстацца ўласнай лодкай. Не ўсе гатовы да такога выпрабавання, і ў любым выпадку з вялікай вадой лепш не жартаваць і абавязкова захоўваць меры бяспекі.

Ужо на пачатку восьмай гадзіны раніцы, калі значная колькасць мясцовых жыхароў дабіраюцца на работу і вучобу, супрацоўнікі МНС гатовы прымаць заяўкі на перавозку людзей на лодцы. Ратавальнікі адпраўляюцца па адрасах, дзе іх чакаюць грамадзяне.

«Праблем ніякіх няма. Мы не хвалюемся і з'язджаць не плануем», — так у асноўным рэагуюць на чарговыя выклікі паводкі жыхары Палявой.

— Нармальна гэта ўспрымаем. Усе ведаюць, што паводка, і нічога такога страшнага, нават «прыкольна» — плывеш на лодцы з самай раніцы, свежым паветрам дыхаеш, — з пазітыўным настроем пра жыццё на падтопленай вуліцы расказаў мясцовы жыхар навучэнец аднаго з гомельскіх каледжаў Антон Самадзед.

Юнак не менш чым два разы на дзень пераадольвае «вулічную акваторыю» на лодцы ратавальнікаў. Ён нават з гонарам зазначае, што іх Якубоўка — знакамітая «гомельская Венецыя».

— Людзі будавалі дамы, і многія ведалі, што бываюць падтапленні. Проста ў апошнія гады моцная паводка, і нават двойчы — зімой і вясной. Цяпер не зразумець, ці будзе яна ў красавіку, як звычайна, ці гэта ўжо ўсё, і вада будзе сыходзіць, — падзялілася турботамі жыхарка Палявой Марына Мельнік.

На любое развіццё паводкавай сітуацыі на гэтым участку горада супрацоўнікі Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС гатовы адрэагаваць аператыўна. На сёння з-за падтаплення вуліцы Палявой у Гомелі ўведзены рэжым павышанай гатоўнасці функцыянавання гарадскога звяна Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

— За час работы мабільнага паста МНС па вуліцы Палявой перавезена 115 чалавек, у тым ліку 9 дзяцей, — адзначыў афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ягор Пасканный. — На дадзены момант адселены два жыхары вуліцы Палявой. Дамы і падворкі іх не падтопленыя, але гэтыя людзі — інваліды, маюць праблемы з апорна-рухальным апаратам. Між тым у цэлым у Гомельскай вобласці падрыхтавана каля 200 месцаў часовага адсялення для грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыях, падтопленых паводкавымі водамі, — звярнуў увагу афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.


Фота БелТА.

Па яго словах, рэжымы павышанай гатоўнасці функцыянавання раённых звёнаў Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый на Гомельшчыне ўведзены таксама ў Гомельскім і Веткаўскім раёнах.

— Акрамя таго, для аказання дапамогі насельніцтву па заяўленым прынцыпе працуе мабільны пост супрацоўнікаў МНС у вёсцы Верхнія Жары Брагінскага раёна, — дадаў Ягор Пасканный.

Па апошняй аператыўнай інфармацыі Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, у Гомельскай вобласці талымі і паводкавымі водамі застаюцца падтопленыя 37 участкаў дарог, 134 жылыя дамы, 26 падвалаў жылых дамоў, 456 падворкаў, 213 гаспадарчых пабудоў і 135 іншых будынкаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# АД БЕСКАНТРОЛЬНАСЦІ ДА БЯДЫ — АДЗІН КРОК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як такое магло адбыцца, што малыя знаходзіліся на вуліцы без суправаджэння дарослых, разбіраюцца кампетэнтныя органы і службы. Бацькам, якія выхоўваюць непаўналетніх, — яшчэ адна нагода задумацца аб тым, як праводзяць час іх дзеці і наколькі гэта бяспечна.

## ПАЙСЦІ І НЕ ВЯРНУЦЦА

Як высветлілася, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нячаста, але атрымліваюць званкі, у якіх паведамляецца аб тым, што згубіліся дзеці. У канцы ліпеня 2022 года дапамога ратавальнікаў спатрэбілася чатырохгадовай дзяўчынцы, якая заблукала ў кукурузным полі каля вёскі Дубовы лес Мінскага раёна.

Да месца здарэння адразу выехала дзяжурная змена пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 4 пасёлка Гатава. У пошукавай аперацыі ўдзельнічаў і начальнік часці Кірыл Чарнашэй. «Мы адразу пагаварылі з мамай, апыталі суседзяў, — расказваў ён. — Поле знаходзіцца каля іх дома. Дзве дзяўчынкі гулялі і забеглі ў поле. Адна з іх выйшла, другая не змагла. Мы падзяліліся і сталі прачэсваць поле, падавалі сігнал, клікалі дзяўчынку па імені. Прайшоўшы ўглыб каля 300—350 метраў, папрасіў па рацыі паўтарыць сігнал, пасля чаго пачуў ціхі плач. Прайшоўшы 50 метраў, знайшоў дзяўчынку і вынес яе на руках да мамы». У пошуку дзіцяці таксама ўдзельнічалі мясцовыя жыхары.

У лютым 2022 года ратавальнікі шукалі непаўналетніх у Барысаве. Вечарам 22 лютага браты, вучні першага і трэцяга класаў, накіраваліся ў Барысаўскую цэнтральную бібліятэку. Па словах знаёмай хлопчыкаў, каля адзінаццаці вечара яна бачыла іх у горадзе: школьнікі селі ў гарадскі аўтобус. Сувязь са згубленымі адсутнічала. Да пошукаў былі прыцягнуты падраздзяленні МНС, супрацоўнікі міліцыі, ваеннаслужачыя, прадстаўнікі адукацыі, ЖКГ і Чырвонага Крыжа — усяго звыш 220 чалавек. У першую чаргу сілы былі накіраваны на прачэсванне дваровых тэрыторый, падвалаў, гарышчаў, таксама абследаваліся чыгуначныя станцыі і саставы. Аглядалі і пойму ракі Бярэзіны. Раніцай наступнага дня дзеці былі знойдзены супрацоўнікамі МНС — вадзіцелямі пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 3 Барысаўскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Алегам Паўлавым і Ягорам Івановым. У медыцынскай дапамозе непаўналетнія патрэбы не мелі.

На слыху — і пошукі адзінаццацігадовага Максіма Мархалюка, які пайшоў у Белавежскую пушчу па грыбы і згубіўся. Здаецца, уся краіна шукала хлопчыка ў верасні 2017 года, аднак ніякай інфармацыі аб яго лёсе дагэтуль няма.

— Сітуацыі, калі дзеці ідуць гуляць у лес ці ў іншае месца без бацькоў, а потым губляюцца, адбываюцца нячаста, але факты маюць месца, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Таму бацькі павінны спрацаваць на апярэджанне і загадзя паклапаціцца аб бяспецы сваіх дзяцей. Не адпускайце дашкольнікаў і малодшых школьнікаў гуляць без дарослых! Суправаджайце іх самі або заручайцеся дапамогай іншых паўналетніх. Не дазваляйце дзецям вяртацца дадому самастойна, нават калі раней яны гэта рабілі...

Калі падазраяце, што дзеці згубіліся, адразу тэлефануйце ў экстранныя службы. Паведамце, дзе і ў колькі гэта адбылося, назавіце прыкметы: апішыце іх знешнасць, раскажыце, у што яны былі адзетыя і інш. Калі вы жывяце побач з лесам, або лес — у крокавай даступнасці там, дзе вашы дзеці праводзяць выхадныя або канікулы, абавязкова патлумачце сваім выхаванцам, што лес — гэта не месца для гульняў. Раскажыце, якія небяспекі там могуць чакаць, навучыце дзіця, што трэба рабіць, калі яно згубілася (алгарытм дзеянняў прыводзіцца ў канцы публікацыі).



Падчас пошукавай аперацыі дзяўчынак у Пухавіцкім раёне.

## АГОНЬ — НЕ ДЛЯ ГУЛЬНІ!

Напярэдадні вясенніх канікул, калі, як гэта часта бывае, некаторыя дзеці будуць знаходзіцца без нагляду дарослых, важна прадугледзець і шэраг іншых небяспечных сітуацый.

Катэгарычна забараняецца пакідаць малых адных дома. Калі няма магчымасці вадзіць іх у дзіцячы садок або школу, а таксама знаходзіцца побач, бацькі павінны знайсці адказных дарослых, якія будуць даглядаць непаўналетніх, пакуль тата і мама на рабоце. Пажадана, каб гэта былі бабулі, дзядулі, іншыя блізкія сваякі, якія (гэта важна!) здольныя ажыццяўляць кантроль за дзецьмі з улікам свайго ўзросту, здароўя, іншых абставін.

Важна прадугледзець усе магчымыя небяспечныя сітуацыі і прагаварыць іх з дзецьмі. Па-першае, патлумачыць, што гуляць з агнём нельга. І абыходзіцца з ім, напрыклад, падчас прыгатавання ежы, варта асцярожна. Нярэдкія выпадкі, калі «эксперыменты» з агнём або банальнае разаграванне ежы заканчвалася не толькі знішчэннем жылля, але і гібеллю непаўналетніх. Многіх трагедый, дарэчы, можна было б пазбегнуць, калі б побач з дзецьмі ў гэты небяспечны момант знаходзіўся хтосьці з дарослых. Дарослы чалавек здольны самастойна справіцца з невялікім узгараннем, рацыянальна ацаніць абстаноўку, дапамагчы ўсім жыхарам пакінуць жыллё ў выпадку, калі патушыць агонь не ўдаецца.

Правільна дзейнічаюць бацькі, калі ўстанаўліваюць у сваіх кватэрах і дамах аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, пры гэтым не баючыся сапсаваць інтэр'ер. Яны ведаюць, што няма нічога даражэйшага за жыццё ўласнага дзіцяці: такая нязначная, на першы погляд, рэч ужо выратавала жыццё не аднаму чалавеку, у тым ліку непаўналетнім.

— Штогод Міністэрства па надзвычайных сітуацыях фіксуе дзясяткі выпадкаў ратавання людзей ад пажараў дзякуючы спрацоўцы аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Сёлета такіх выпадкаў ужо больш як 20. І гэта толькі афіцыйныя даныя, калі званок аб пажары паступіў у падраздзяленне МНС. Вялікая колькасць выпадкаў адбываецца на побытавым узроўні, калі аўтаномны пажарны апавяшчальнік папярэджвае свайго гаспадара, а той прымае ўсе неабходныя меры, выкарыстоўваючы спадручныя сродкі для ліквідацыі ўзгарання.

Па словах афіцыйнага прадстаўніка ведамства, вельмі часта гаворыцца аб вогненных трагедыях, ахвярах агню, але практыка паказвае, што чалавек на пажары гіне не ад тэмпературнага ўздзеяння, а з-за ўгарнага газу, калі ўдыхае мноства прадуктаў гарэння. «Уласцівасць дыму такая, што пры гарэнні або нават тленні дым ідзе наверх (ён лягчэйшы за паветра) і ў самым пачатку запаўняе прастору памяшкання пад столлю, пасля чаго спускаецца і запаўняе ўсё памяшканне, і чалавек, які, напрыклад, спіць, робіць некалькі ўдыхаў і ўжо самастойна не прачынаецца, — тлумачыць Яўген Бараноўскі. — Таму МНС настойліва рэкамендуе ўстанаўліваць аўтаномны пажарны апавяшчальнік у кожным жылым пакоі. Ён на самай ранняй стадыі ўзгарання разбудзіць вас або папярэдзіць, калі вы не знаходзіцеся ў памяшканні. Менавіта дзякуючы гэтаму вы зможаце прыняць самыя хуткія меры па рэагаванні і не дапусціць вялікай трагедыі. Па факце аўтаномны пажарны апавяшчальнік — самы эфектыўны і танны сродак пасіўнай абароны, які не патрабуе ніякіх укладанняў».

## ЗАЧЫНІЦЕ ВОКНЫ!

Яшчэ адна з найбольш частых прычын дзіцячай гібелі і траўматызму ў канікулярны перыяд — адчыненыя вокны. Трагічныя выпадкі адбываюцца кожны год, аднак, на жаль, многія сем'і, якія выхоўваюць малых, думаюць, што падобнае іх не закране.

Дарослыя, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, павінны раз і назаўсёды ўсвядоміць, што адчыненыя насцеж вокны для іх сям'і — табу! І не варта спадзявацца на маскітную сетку. Колькі трагедый адбылося менавіта з-за гэтага. Ужо з кожнага праса паведамляюць, што маскітная сетка абсалютна не ўтрымлівае вагі нават самага маленькага дзіцяці, не кажучы ўжо пра дзіця сярэдняга ўзросту або старшакласніка. Каб пазбегнуць трагедый, лепш увогуле вашы вокны зачыніць на замок — забудоўшчыкі сучаснага жылля прадугледзелі гэты момант і здаюць кватэры ўжо з ключамі на кожным акне. Калі ў вас такога «бонусу» няма, то варта аб ім паклапаціцца, — нават малому дзіцяці не складана адчыніць акно ў вашу адсутнасць.

Зачыніць дарослага ў іншым пакоі, на балконе або за ўваходнымі дзвярыма, калі ён пайшоў, напрыклад, выкінуць смецце, дзеці таксама могуць. У канцы лютага ратавальнікам Мар'інай Горкі паступіла паведамленне аб тым, што на балконе кватэры на чацвёртым паверсе двухгадовае дзіця зачыніла маму. Супрацоўнікаў МНС выклікалі суседзі, якія пачулі, як жанчына клікала на дапамогу. Ратавальнікі падняліся на балкон па аўталесвіцы, дзякуючы спецыяльнаму інструменту адчынілі дзверы ў кватэру. На шчасце, у той час, пакуль маці «дыхала свежым паветрам» на балконе, з яе малой дачушкай нічога не здарылася. А магло быць зусім інакш.

**Дарослыя, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, павінны раз і назаўсёды ўсвядоміць, што адчыненыя насцеж вокны для іх сям'і — табу! І не варта спадзявацца на маскітную сетку. Колькі трагедый адбылося менавіта з-за гэтага.**

## КАБ НЕ ТРАПІЦЬ У «ПАСТКУ»...

Апошнім часам пачасціліся выпадкі траўміравання дзяцей на дзіцячых пляцоўках і ў іншых месцах — падобныя надзвычайныя сітуацыі фіксуюцца ратавальнікамі практычна штодзень. Шукаючы сабе прыгод на пятую кропку, дзеці ў прамым сэнсе трапляюць у «пастку». Некаторыя становяцца заложнікамі надзвычайнай сітуацыі па неасцярожнасці. Днямі, напрыклад, ратавальнікі прыйшлі на дапамогу юнаму мінчаніну, які не мог самастойна выбрацца з гразі. Здарэнне адбылося на вуліцы Надзеждзінскай. Як высветлілася, хлопчык гуляў пасля школы і трапіў туды, адкуль самастойна ўжо не мог выбрацца, — калі прыбылі ратавальнікі, ён знаходзіўся па пояс у гразі. Супрацоўнікі МНС даставілі хлопчыка на сухую паверхню. На шчасце, дапамога медыкаў яму не спатрэбілася.

А ў Навапалацку супрацоўнікі МНС дапамагалі дзіцяці выбірацца з... фантана. Як школьнік апынуўся ў цэнтры канструкцыі, на надбудове-распыляльніку, доўга разважаць не трэба. У выніку дзіцячае свавольства скончылася шпіталізацыяй — з агульным пераахаладжэннем (фантан быў не пусты) непаўналетні накіраваўся ў бальніцу.

Астравецкія ратавальнікі дапамагалі дзяўчынцы дастаць нагу, заціснутую ў радыятары. Як потым расказала пацярпелая, яна сядзела каля радыятара, абапіраючыся на яго нагамі. У нейкі момант адна нага саскочыла і засела паміж секцыямі. Ратавальнікі акуратна расціснулі рэбры батарэі і дасталі нагу дзіцяці. Брыгада хуткай дапамогі, якая прыбыла, агледзела дзяўчынку, медыцынская дапамога ёй не спатрэбілася.

Падобных сітуацый даволі шмат. Прадугледзець многія — задача бацькоў. У дапамогу дарослым — мультфільмы ад ратавальнікаў «Чароўная кніга» і «Спецатрад 112», якія можна адшукаць на афіцыйным канале ведамства на YouTube. Падлеткам рэкамендуецца ўстанавіць мабільны дадатак «Дапамога побач», які падкажа, як дзейнічаць у той ці іншай надзвычайнай сітуацыі. І галоўная парада бацькам ад ратавальнікаў — быць станоўчым прыкладам для свайго дзіцяці, ведаць, з кім яно сябруе і як праводзіць час. Гэтыя простыя рэкамендацыі дазволяць трымаць непаўналетніх пад кантролем, а значыць, пазбегнуць бяды.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Мінскага гарадскога і Мінскага абласнога ўпраўленняў МНС.**

### Што рабіць дзіцяці, калі яно згубілася ў лесе:

— пры наяўнасці мабільнага тэлефона патэлефанаваць бацькам або ратавальнікам па нумары 101 або 112;
— заставацца на месцы і гучна клікаць на дапамогу;
— не баяцца адгукацца на сваё імя, калі клічуць чужыя людзі;
— не падыходзіць да вадаёмаў і балот;
— не есці незнаёмыя ягады і грыбы;
— пры сустрэчы з дзікай жывёлай не рухацца і не нападаць на яе, а даць жывёле магчымасць спакойна сысці.

З нагоды

# Гармонія тэхналогій і традыцый

## Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі адзначыў 60-гадовы юбілей

**За час, пройдзены з моманту заснавання, БДУІР аказаў значны ўплыў на развіццё айчынных навукі, адукацыі і прамысловасці. Таму нядзіўна, што павіншаваць са святам слаўны калектыў прыбылі прадстаўнікі органаў кіравання краіны і флагманаў прамысловасці Беларусі. Прымаў гэтымі днямі ўніверсітэт і замежных гасцей — навукоўцаў з Расіі, Кітая, Узбекістана, Казахстана, Індыі, Таджыкістана і іншых краін.**

У рамках святочных мерапрыемстваў адбылося адкрыццё пастаянна дзейнай выставы навукова-тэхнічных распрацовак універсітэта. Таксама напярэдадні юбілейнага свята ВНУ арганізавала маштабную міжнародную навукова-метадычную канферэнцыю «Інжынерная адукацыя ў лічбавай супольнасці». Своечасовая і сучасная, яна прадугледжвала грунтоўныя тэхнічныя даклады і выступленні. Так і было. Аднак у прывітальным слове рэктар БДУІР Вадзім Богуш адзначыў: «На якія б вяршыні не падымаліся тэхналогіі, як бы настойліва ні прабіваў сабе шлях у будучыню штучны інтэлект, самым каштоўным былі і застаюцца жывыя, чалавечыя зносіны, якія мы маем з вамі сёння». А тое, што ў Мінск на канферэнцыю прыехала пераважная большасць запрошаных з розных краін (не абмежаваўшыся менш затратным і больш зручным анлайн-удзелам), надало словам Вадзіма Анатолевіча асаблівы сэнс.

Кіраўнік універсітэта расказаў таксама аб укараненні сучасных тэхналогій.

«Мы з'яўляемся адным з першых універсітэтаў краіны, які пачаў займацца пытаннямі лічбавай адукацыі і дыстанцыйнага навучання. Метадам спроб і памылак, а таксама вывучаючы вопыт нашых калег, мы дастаткова нядрэнна рухаемся ў кірунку, звязаным з укараненнем сучасных тэхналогій у адукацыйны працэс. Гэтыя тэхналогіі становяцца элементамі ўніверсітэцкага інфармацыйнага асяроддзя і садзейнічаюць павышэнню якасці адукацыі», — сказаў ён.

Вадзім Богуш таксама адзначыў, што ключавая мэта ВНУ — стварэнне экаасяроддзя, якое спрыяла б якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Далей рэктар засяродзіў увагу на адказнасці вучонага і педагога за будучыню тэхналагічнага развіцця: «Без яго, з аднаго боку, немагчыма эканамічная перавага і сапраўдны суверэнітэт для нашай краіны, а з другога — гэта патрабуе сур'ёзнага аналізу ў пытаннях бяспекі і развіцця тэхналогій...»



Рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ.

Аднак вернемся да канферэнцыі. Яе ўдзельнікамі сталі каля 300 чалавек: вядучыя эксперты ў галіне падрыхтоўкі інжынерных кадраў, прадстаўнікі навучальных устаноў, профільных міністэрстваў і ведамстваў, якія курыруюць і ўкараняюць лічбавыя рашэнні ў сферу адукацыі.

На пленарным пасяджэнні абмяркоўваліся пытанні фарміравання новай мадэлі сучаснай інжынернай адукацыі. Асабліва цікавай гэтая тэма была ў частцы арыентацыі на вырашэнне задач інавацыйнага развіцця краіны. Тут жа гаварылася і пра мнагамернае крэатыўнае мысленне, а таксама пра нанатэхналогіі, дапоўненую рэальнасць і інш.

На ўдзел у канферэнцыі было пададзена 240 дакладаў — рэкордная лічба. Таму і работа ў секцыях, якая пачалася пасля пленарнага пасяджэння, выдалася асабліва напружанай.

Самай шматлікай была секцыя, прысвечаная падрыхтоўцы інжынерных кадраў ва ўмовах алічбоўкі эканомікі: удзел узялі 22 спікеры. Трэба адзначыць, што тэмы семінараў і пасяджэнняў закраналі розныя аспекты інжынернай адукацыі. Гэта і станаўленне асобы інжынера ва ўмовах гібрыдных пагроз, і інтэграцыя тэхнічнага і гуманітарнага — новы падыход да адукацыі інжынераў будучыні. Расійскія навукоўцы падзяліліся праблемамі і перспектывамі мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі ў сваёй краіне. Ішла размова і аб тым, якія стылі навучання выкарыстоўваюцца тэхнічнымі ВНУ сёння і якімі іх бачаць у будучыні. Разглядаліся нават філасофскія аспекты выкарыстання штучнага інтэлекту і такая праблема, як развіццё жыццеўстойлівасці студэнтаў інжынерных спецыяльнасцяў.

Канферэнцыя вылілася ў вялікую размову не толькі аб тым, якія формы і метады навучання інжынераў выкарыстоўваюцца сёння і якімі яны павінны быць у ідэале. Размаўлялі і аб надзённым, і аб тым, ці стане дабром для студэнтаў поўны пераход працэсу навучання да ІТ-тэхналогій і ці не сыдзе са студэнцкага жыцця яго такая важная частка, як зносіны з выкладчыкамі і аднакашнікамі...

У перапынку мы папрасілі Андрэя Ліхавіда, першага прарэктара Паўночна-Каўказскага федэральнага ўніверсітэта, адказаць, якія трэнды сёння існуюць у падрыхтоўцы інжынерных кадраў і як ён ацэньвае падрыхтоўку спецыялістаў у ВНУ Беларусі.

«У любым інжынеры самы важны складнік той, які ён атрымлівае ў працэсе адукацыі. Сёння прынята дзяліць: інжынер мінулага, сучаснага, будучага... Не стану доўга разважаць на гэту тэму, выкажу сваё меркаванне. Ніякі штучны інтэлект не зробіць з рамесніка сапраўднага майстра. Сэнс адукацыі — спосаб мыслення, а галоўным трэндам і з'яўляецца тое самае мысленне. Так было ва ўсе часы. Мысленне інжынера адрозніваецца ад клінічнага мыслення доктара, ад навуковага мыслення навукоўца. Ніякі штучны інтэлект не заменіць урокі майстра — працэсу, дзе сваю ролю іграе нават самая нязначная дробязь, дзе інтанацыя і нават погляд маюць свой асаблівы сэнс. Калі ў эканоміку краіны прыйдуць інжынеры з мысленнем рамесніка, не будзе ніякай эканомікі...

На шчасце, у Беларусі доўгі час захоўваецца сэнсавы суверэнітэт у інжынернай адукацыі. Гэтую сферу нельга назваць кансерватыўнай, але яна мае выразныя рысы суверэннасці, дзе гарманічна існуюць новыя тэхналогіі і традыцыі ў падрыхтоўцы інжынерных кадраў. І гэта — правільна абраны шлях», — зазначыў расійскі навуковец.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**



Фота з архіва ўніверсітэта.

Падчас правядзення канферэнцыі.

# Ліванскі сябар віцебскіх рагуль

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Сінявокую 26-гадовы ліванец паехаў вучыцца ўслед за таварышам, які атрымліваў дыплом Віцебскай ветакадэміі. З дзяцінства Халіл хацеў лячыць братоў нашых меншых, да таго ж беларускі дыплом на яго радзіме мае вялікую каштоўнасць. Але жаданне працаваць з жывёламі прыйшло не само па сабе, правільней сказаць — перадалося ў спадчыну. Яго бацька таксама медык, усё жыццё трымаў і цяпер трымае фермерскую гаспадарку, якая спецыялізуецца на малочнай вытворчасці. Сёння ў сям'і Халіла 30 рагуль. Занятак жывёлагадоўляй, прадукцыя якой запатрабавана ў Ліване, з'яўляецца іх невялікім сямейным бізнесам, таму пра цяжкасці і адначасова прыемныя моманты абыходжання з каровамі Балут ведаў з юнацтва. А яшчэ хлопцу давялося на сваёй радзіме дапамагаць сябрам у ветэрынарнай клініцы.

Сёння малады ветурач шчыруе ў агракомплексе «Адраджэнне» ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка», ахінае клопатам каля 970 рагуль, і гэта толькі дойнага статку. Нягледзячы на тое, што Халіл спецыялізуецца на гінекалогіі, ён з лёгкасцю выконвае хірургічныя маніпуляцыі, лечыць уколамі. Кіраўніцтва агракомплексу адзначае, што такіх маладых спецыялістаў, якія гараць сваёй справай, няшмат, усе яны вельмі цэняцца ў гаспадарцы. Акрамя высокай зарплаты, для высокакваліфікаваных кадраў будуюць арэнднае жыллё. Вось і цяпер агракомплекс плануе ўзвесці дамы для сваіх работнікаў у аграгарадку Кіраўская, і Халіл — адзін з першых у чарзе на атрыманне ключоў. Калегі па цэху таксама адзначаюць, што эфектыўнасць узнаўлення з прыходам ветурача вырасла з 28 да 60 працэнтаў.



Халіл вучыўся ў Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны шэсць гадоў. Да прыезду ў Беларусь хлопец ведаў родную арабскую, а яшчэ англійскую і французскую мовы, якія вывучаў у школе. Цяпер ён амаль свабодна размаўляе на рускай. Выдаюць госця з Блізкага Усходу толькі акцэнт і прамяністая ўсмешка, якая ўдала падкрэслівае карыя вочы. «У Віцебску да паступлення ў акадэмію я на працягу сямі месяцаў вучыў рускую мову. І яна мне даволі лёгка далася, бо разумею, што, калі я хачу атрымліваць веды, трэба старацца», — расказвае Халіл.

Практыку па спецыяльнасці ён праходзіў у Ноўцы Віцебскага раёна і ў Ліване, аднак вяртацца на радзіму не спяшаецца. Пасля акадэміі пачынаў свой прафесійны летапіс на вытворчым участку «Вымна» УП «Рудакова», а пасля перайшоў у «Адраджэнне». Там, на першым працоўным месцы, у яго былі падапечныя з надта цікавымі мянушкамі: Тэкіла, Талерка, Тазік. Але і цяпер сярод рагуль, якія штодзень сустракаюць свайго ўрача, ёсць Мурка і іншыя, нетыповыя для кароў мянушкі.

У Беларусі, лічыць ліванец, створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця: добрая зарплата ў параўнанні з адносна невысокімі цэнамі, магчымасць падымацца па кар'ернай лесвіцы адразу пасля атрымання дыплома, развітая інфраструктура, багацце прыроды і экалагічна чыстыя прадукты. А яшчэ малады чалавек адзначае, што беларусы гасцінныя і адкрытыя, і наколькі вялікае шчасце жыць у спакойнай і мірнай краіне.

Сярод таго, чым Беларусь уразіла замежнага госця, — нашы класічныя дранікі. Хоць у Ліване бульбу вырошчваюць таксама, такой стравы там не ведаюць. Халіл за столькі гадоў жыцця ў паўночным рэгіёне і сам асвоіў гэты нехітры кулінарны шэдэўр. Яшчэ на сваёй радзіме малады чалавек захапляўся рыбалкай, былі ў яго і асабістыя рэкорды. А вось Беларусь здзівіла тым, што тут замярзаюць азёры, таму падлёдная рыбалка стала яго хобі. Балут нават паспеў паўдзельнічаць у раённых спаборніцтвах па зімовай лоўлі. А на лета ветурач прыкупіў сабе гумавую лодку, марыць наведаць Браслаўшчыну з яе знакамітымі азёрамі.

Нягледзячы на тое, што дома хлопец бывае нячаста, часцінка яго сям'і — сястра Рыма, якая вучыцца ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім каледжы, — жыве побач з ім у паўночнай сталіцы. Аб сваёй абранай прафесіі Балут не шкадуе, ён перакананы, што працаваць з жывёламі цікавей, бо яны не могуць сказаць, дзе баліць. «Трэба ўмець слухаць, назіраць і нават чытаць па вачах. Жывёлу не падманеш, яна лёгка адчувае твае намеры і настрой», — дзеліцца ліванец сакрэтам паспяховай працы.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витьбичи».**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого повторного аукциона со снижением цены на 20 % по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства 4 апреля 2024 года в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Наименование подразделения Департамента – **Управление Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь по Гомельской области** | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 300/С-3613** общей площадью **3336,4 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание цеха металлоконструкций, составные части и принадлежности: 1А1/кп – здание цеха металлоконструкций, 1Б1/к – пристройка, а – дорога из асфальта. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 305А/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005000294 площадью 28,2821 га (право постоянного пользования). **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственной базы треста стройиндустрии и комплектации № 5. **Ограничение (обременение):** запрещение совершения регистрационных действий, арест | ИМНС по Советскому р-ну г. Гомеля | **677 520,00** | 67 752,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-70781** общей площадью **2622,9 кв. м,** назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – здание арматурного цеха с вентиляционными пристройками, составные части и принадлежности: 3Б1/к – пристройка, 3В/к – пристройка, а – дорога из асфальта. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 305А/2. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005000294 площадью 28,2821 га (право постоянного пользования). **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственной базы треста стройиндустрии и комплектации № 5. **Ограничение (обременение):** запрещение совершения регистрационных действий, арест | ИМНС по Советскому р-ну г. Гомеля | **513 360,00** | 51 336,00 |

Шаг аукциона – 5 %. Участник торгов обязан до начала торгов осмотреть предмет торгов. Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) осуществляется по контактному тел. по лотом № 1, № 2: **8 29 1963337, Юрий Андреевич.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»): р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №_ проводимом 4 апреля 2024 г. (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка с отметкой банка можно **с 20 марта 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 02 апреля 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Лоты могут быть сняты Организатором по письменному заявлению Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь до объявления его проданным. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов** (далее – Претендент на покупку), не позднее **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного имущества не позднее **20 (двадцати) рабочих дней** со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента по покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по оплате предмета торгов.

**Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства» (Указ Президента РБ от 19.02.2016 г. № 63).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего строительному унитарному предприятию «Гродненская СПМК»

**Аукцион состоится 10.04.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129462 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – покрытие автодрома), общей площадью 2 425,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000001010570 площадью 0,2848 га (назначение – земельный участок для обслуживания сооружения специализированного транспорта), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот 1 имеет обременения со стороны 3-х лиц в виде аренды части асфальтобетонного покрытия, площадью 90,0 кв. м, сроком по 31.12.2024 г. Условия проведения аукциона – условия оплаты: оплата полной стоимости объекта недвижимости производится не позднее 15 (пятнадцати) банковских дней с момента заключения договора |
| **Начальная цена продажи** | 210 000 руб. (двести десять тысяч рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 21 000 руб. (двадцать одна тысяча рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 08.04.2024 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.05.2023 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

---

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Минимальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автотранспортный участок, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102** | 2 489 475,60 | 1 742 632,92 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by, и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **1 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 22.04.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 20.03.2024 по 19.04.2024 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Литвяны-Агро»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ БАНИ

**с инв. № 623/С-60963 общей площадью 192 м², расположенной на земельном участке с кадастровым номером 625684206001000265 площадью 0,1328 га (право аренды по 2072 г.) по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Литвяны, ул. Школьная, 8Е.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **3 690,24** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **369,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 80 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001 69330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» 31.08.2023, 10.11.2023, 16.01.2024.

Аукцион состоится **04.04.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.04.2024 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8029) 882-76-94, (801718) 60-3-72, 60-3-82.**

УНП 600002346

---

### Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Предмет аукциона – лот № 1:**

**ГРУЗОВОЙ САМОСВАЛ МАЗ 5551 А2,** год выпуска 2008 г., регистрационный знак АВ 5644-1, кузов № Y3M5551A290001674

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 13 920,00 | Размер задатка, руб. | 1 392,00 |
|---|---|---|---|

**Местонахождение:** Брестская обл., г. Пинск, ул. Козубовского, 25. **Организатор торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by. **Продавец:** УСП «СПМК-35» 225710, Брестская обл., г. Пинск, ул. Козубовского, 25, тел./факс 80165642266. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг торгов:** 5 %

**Электронные торги состоятся 24 апреля 2024 г. в 11.00**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG».
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, электронных торгов размещена на ЭТП

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 22.04.2024 до 16.00**

---

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 25 апреля 2024 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Узбережье, пос. Усяж

***Организатор аукциона: Усяжский сельский исполнительный комитет, 222212, пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10.***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **дер. Узбережье, ул. Лесная, 8 (объект № 70/2022)** | 624885606101000032 | 0,1354 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 10 000,00 |
| 2 | **пос. Усяж, ул. Промышленная, 22Б (объект № 124/2021)** | 624885606601000327 | 0,1063 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 20 000,00 |
| 3 | **пос. Усяж** | 624885606601000057 | 0,1499 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 15 000,00 |

Аукцион состоится **25 апреля 2024 г. в 10.00** в Усяжском сельском исполнительном комитете по адресу: ***пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***, кабинет председателя.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600023836

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
20 сакавіка 2024 г. № 11 (744)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# «ВЫ ПАТРЭБНЫ СВАЁЙ КРАІНЕ, СВАЙМУ НАРОДУ»

## Якія пажаданні Наталля КАЧАНАВА адрасавала школьнікам, уручаючы ім пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь







Фота БелТА.

**Мінулы тыдзень праходзіў пад знакам 30-годдзя Асноўнага Закона краіны. З нагоды гэтай даты маладыя людзі з усёй краіны ва ўрачыстай абстаноўцы атрымлівалі свае першыя галоўныя дакументы — пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Некаторым хлопцам і дзяўчатам, якія дасягнулі поспехаў у вучобе, спорце, творчасці і грамадскай дзейнасці, пашчасціла атрымаць іх з рук Старшыні Савета Рэспублікі.**

Наталля Качанава назвала ўручэнне пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь адной з самых добрых традыцый у нашай краіне і выказала меркаванне, што гэтая падзея застанецца ў жыцці маладога чалавека на доўгія гады. «Памятайце, што вы патрэбны сваёй краіне, свайму народу, і вы павінны рабіць усё дзеля таго, каб наша краіна заставалася свабоднай, суверэннай і незалежнай, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — Ад вас у многім гэта залежыць».

Наталля Качанава расказала аб той маштабнай рабоце, якая была праведзена парламентарыямі па прывядзенні беларускага заканадаўства ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй. Свае прапановы накont змянення і дапаўнення Асноўнага Закона краіны ўнеслі і члены Савета Рэспублікі.

Кажучы аб заканадаўчай дзейнасці, Наталля Качанава адзначыла, што парламентарыі робяць усё дзеля таго, каб наша краіна развівалася так, як развіваецца сёння. «Мы ўсе з вамі разумеем, у якой цудоўнай краіне жывём: прыгожай, дагледжанай, уладкаванай, — падкрэсліла спікер. — І ўсё дзякуючы людзям, якія стваралі ўсе гэтыя даброты. 30-годдзе Асноўнага Закона краіны з'яўляецца важнай падзеяй у гісторыі, якую адзначаюць беларусы і ганарацца тым, што жывуць у свабоднай, суверэннай і незалежнай краіне. І мы вельмі спадзяёмся на тое, што гэтыя слаўныя добрыя традыцыі будзеце працягваць вы. Ужо сёння вы працуеце сваёй вучобай. Сваімі дасягненнямі ўносіце свой уклад у будучыню нашай краіны».

Пасля ўрачыстай цырымоніі ўручэння пашпартоў адбыўся дыялог Старшыні Савета Рэспублікі і маладых людзей. Хлопцы і дзяўчаты задалі спікеру пытанні, якія іх цікавяць. Гаварылі пра любоў да малой радзімы, у цэлым да краіны, пра важнасць школьнага навучання, якасць ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Закранулі і вострыя праблемы.

Адказваючы на пытанне аб найбольш важным для сучаснай моладзі, Наталля Качанава падкрэсліла, што маладыя людзі павінны разумець сваё прызначэнне. «Усё, што вы сёння зробіце карыснага і патрэбнага, усё будзе ў вашу скарбонку ў далейшым, — арыентавала яна хлопцаў і дзяўчат. — І творчасць, і спорт, і патрыятычныя акцыі — гэта ўсё вельмі важна, гэта вызначае далейшае ваша жыццё і лёс».

Спікер расказала, што VI Усебеларускі народны сход вызначыў асноўныя кірункі развіцця нашай краіны. «Важна, каб рэгіёны ў нашай краіне развіваліся аднолькава, каб усюды была магчымасць займацца творчасцю, музыкай, спортам, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Сёння трэба зрабіць так, каб нашы людзі заставаліся ў рэгіёнах».

Патлумачыла спікер і сутнасць яшчэ аднаго, не менш важнага кірунку, вызначанага VI Усебеларускім народным сходам, — дэмаграфічнай бяспекі. Яна падкрэсліла, што будучыня — за сямейнымі каштоўнасцямі.

Адзін са школьнікаў пацікавіўся, што для Старшыні Савета Рэспублікі з'яўляецца прыкладам беларускай якасці. «Год якасці — гэта мудрае рашэнне нашага Прэзідэнта, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Сёння мы можам смела ганарыцца Беларуссю. Яна развіваецца на карысць народа. Год якасці — гэта не толькі аб таварах, якія выпускаюцца ў нашай краіне. Гэта і адукацыя, напрыклад, і праца кожнага чалавека, і ўсё тое, што вызначае нашу краіну. Вядома, гэта і канкурэнтаздольнасць, і эканамічнае развіццё Беларусі».

Напрыканцы сустрэчы школьнікі спыталі ў спікера, які дзень у прафесійнай дзейнасці ёй запомніўся назаўжды. Як высветлілася, самым запамінальным у кар'еры Наталлі Качанавай стаў той дзень, калі Прэзідэнт узгадняў яе на пасаду старшыні Наваполацкага гарвыканкама. «Я вельмі хвалявалася, але, паслухаўшы Аляксандра Рыгоравіча, выйшла з распраўленымі плячыма, — узгадала яна. — Можна нават сказаць, гэты дзень карэнным чынам памяняў маё жыццё».

**Вераніка КАНЮТА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Не толькі назіранне, але і супрацоўніцтва

● 27 сакавіка Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Інфармацыя аб папярэднім запісе на прыём — на афіцыйным сайце Савета Рэспублікі.

● Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла тэлефонную размову са Старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Матвіенка: Наталля Качанава павіншавала Валянціну Матвіенка і яе калег з паспяховым правядзеннем выбараў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі і пераканаўчай перамогай на іх Уладзіміра Пуціна.

***

● Члены Савета Рэспублікі Сяргей Анюхоўскі, Дзмітрый Баскаў, Валерый Гайдукевіч, Марына Ільіна на мінулым тыдні прынялі ўдзел у рабоце міжнародных назіральнікаў на прэзідэнцкіх выбарах у Расійскай Федэрацыі. Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Міхаіл Русы выступіў каардынатарам групы назіральнікаў ад Міжпарламенцкай Асамблеі СНД. У рамках гэтай работы сенатар правёў шэраг важных сустрэч. Міхаіл Русы сустрэўся з намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Юрыем Вараб'ёвым. Ён перадаў словы віншавання ад Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай расійскім калегам з паспяховым правядзеннем выбараў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі і пераканаўчай перамогай на іх Уладзіміра Пуціна. Адбыўся абмен думкамі аб развіцці выбарчага заканадаўства Беларусі і Расіі, ролі інстытута міжнароднага назірання. У ходзе сустрэчы абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковага парадку дня з акцэнтам на міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Абмеркаваны ход падрыхтоўкі XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе 26—28 чэрвеня ў Беларусі — у гарадах Віцебску, Полацк і Наваполацку, — і будзе прысвечаны ролі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў пабудове інавацыйнай эканомікі Саюзнай дзяржавы.



Падчас сустрэчы з намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Канстанцінам Касачовым Міхаіл Русы расказаў, што расійскі вопыт, у прыватнасці, прымяненне новых інфармацыйных тэхналогій і грамадскі кантроль за выбарамі, выклікаюць вялікую цікавасць. Таксама Міхаіл Русы разам з назіральнікамі ад МПА СНД сустрэліся са Старшынёй Дзяржаўнай Думы Вячаславам Валодзіным.

Назіранне беларускімі парламентарыямі таксама праводзілася ў складзе Місіі назіральнікаў ад СНД па лініі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, а таксама па запрашэнні кіраўнікоў палат Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі. У рамках назірання парламентарыі прынялі ўдзел у Міжнароднай канферэнцыі «Электаральны суверэнітэт і міжнародныя стандарты», арганізацыйных нарадах груп міжнародных назіральнікаў, рабоце Інфармацыйнага цэнтра Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі, правялі сустрэчы з кіраўніцтвам Савета Федэрацыі і Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі, кандыдатамі на пасаду Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ад палітычных партый.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «КАЛІ ЛЮДЗЯМ НЕШТА ПААБЯЦАЛІ, ТРЭБА ЗРАБІЦЬ»

## Новы старшыня Магілёўскага аблсавета Аляксандр ГАРОШКІН пра пасаду, работу з насельніцтвам, жыццёвы вопыт і галоўныя прыярытэты

**Аляксандр Гарошкін — чалавек, добра вядомы на Магілёўшчыне. Працяглы час ён быў ваенным камісарам вобласці, потым працаваў ідэолагам на вядучым прадпрыемстве «Магілёўліфтмаш». Паралельна ўзначальваў і працягвае ўзначальваць абласную арганізацыю грамадскага аб'яднання «Белая Русь», а таксама з'яўляецца членам вышэйшага палітсавета беларускай партыі з аднайменнай назвай. Мае тры медалі «За бездакорную службу» трох ступеняў, Падзяку Прэзідэнта, неаднойчы адзначаўся Ганаровымі граматамі аблвыканкама, станавіўся «Чалавекам года Магілёўшчыны». Сёння старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў 29-га склікання пагадзіўся адказаць на пытанні «МС».**

***— Наколькі знаёмая вам новая работа? Ці даводзілася раней займацца дэпутацкай дзейнасцю? — спыталася карэспандэнт «Звязды» ў новага кіраўніка дэпутацкага корпуса.***

— На пасадзе старшыні аблсавета я нядаўна, але да гэтага даводзілася займацца справамі, якія пераклікаюцца з дэпутацкай дзейнасцю. Практычна пяць гадоў узначальваю Магілёўскае аддзяленне грамадскага аб'яднання «Белая Русь». А гэта работа з людзьмі, падтрымка грамадзянскіх ініцыятыў, правядзенне розных акцый. Мне вельмі добра знаёмы наш рэгіён. На працягу 12 гадоў, будучы ваенным камісарам вобласці, я з'яўляўся членам Магілёўскага аблвыканкама. Быў адказны і за пэўныя раёны, таму ведаў не па чутках, як наша сельская гаспадарка развіваецца, як працуе прамысловасць. Сам непасрэдна прысутнічаў на ўсіх мерапрыемствах, таму не адчуваю сябе навічком на гэтай пасадзе. Заўсёды жыў па прынцыпе: калі можаш дапамагчы чалавеку — дапамажы, калі не — скажы адкрыта. Не ўмею абяцаць таго, чаго ў прынцыпе зрабіць не магу.

***— І ўсё ж такі ці атрымалася за кароткі тэрмін знаходжання на новым месцы адчуць розніцу з папярэдняй дзейнасцю?***

— Так. Вялікая колькасць людзей выказала мне давер спачатку як кандыдату, потым як дэпутату, а затым і як старшыні аблсавета. Звяртаючыся да дэпутацкага корпуса, я адразу ж папярэдзіў, што задачы прадстаўнічай і выканаўчай улады аднолькавыя. І толькі ў цесным узаемадзеянні можна разлічваць на поспех. На сустрэчах з дэпутатамі ў раёнах нагадваю ім, што іх галоўная місія — быць сярод людзей. І ісці не туды, дзе ўсё добра, а туды, дзе ёсць праблемы. Ісці і выслухоўваць заўвагі і скаргі, а потым садзіцца за стол з выканаўчай уладай і шукаць шляхі вырашэння. Знайсці, а затым растлумачыць людзям, якія праблемы вырашацца хутчэй, якія — пазней. І потым кантраляваць ход выканання.

***— Як першапачаткова ацэньваеце склад дэпутацкага корпуса 29-га склікання?***

— З мінулага склікання засталіся людзі, якія сябе ўжо праявілі, і выбаршчыкі іх падтрымалі, а таксама прыйшлі новыя са сваімі ідэямі, думкамі. Будзем выкарыстоўваць вопыт тых, хто ўжо працаваў, і патэнцыял тых, хто прыйшоў упершыню. Праверым, ці ўсё выканана з таго, што абяцаў папярэдні склад. Гэта ў першую чаргу бярэцца на кантроль. Калі людзям нешта паабяцалі, трэба зрабіць.

***— Тым, хто ўпершыню становіцца дэпутатам, бывае складана адразу ж уліцца ў працэс. Ці збіраецеся арганізаваць вучобу для народных выбраннікаў?***

— Навічкам раздалі памяткі, як працаваць дэпутату. Да красавіка яны могуць агледзецца на месцах і вызначыцца. Перад



тым як чалавека вучыць, варта зразумець, што ён хоча ведаць. Калі наваспечаны дэпутат унікне ў сутнасць справы, то зразумее, што яму трэба, каб наладзіць адносіны з людзьмі, уладай. Пачнём праводзіць заняткі з аблсавета, потым пойдзем на раёны. У падтрымку ёсць Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, яна бярэ на сябе распрацоўку метадычнага матэрыялу, у тым ліку планаў правядзення гэтых заняткаў. Будзем запрашаць палітолагаў, прадстаўнікоў арганізацыйна-кадравай службы, спецыялістаў з розных сфер. І такая вучоба будзе праводзіцца як мінімум раз у паўгода або па меры неабходнасці.

> Не адчуваю сябе навічком на гэтай пасадзе. Заўсёды жыў па прынцыпе: калі можаш дапамагчы чалавеку — дапамажы, калі не — скажы адкрыта. Не ўмею абяцаць таго, чаго ў прынцыпе зрабіць не магу.

***— Якія планы па ўдасканальванні дэпутацкай работы? Можа, на ваш погляд, чагосьці не хапае з таго, што бачылі, калі дэпутацкую дзейнасць ацэньвалі як звычайны грамадзянін.***

— Я катэгарычна супраць рэвалюцый. Не трэба нічога разбураць, каб пабудаваць нешта новае. Трэба агледзецца. Я заўсёды за эвалюцыйны шлях развіцця. Збіраю водгукі людзей, каб ведаць, чаго яны чакаюць ад дэпутата. Зразумела, што не ўсё, што людзі патрабуюць, у яго сілах. Рэзкіх рухаў быць не павінна. У нас наладжаная сістэма і выразная вертыкаль. А жыццё само ўносіць карэктывы, і мы на гэтыя змены павінны хутка рэагаваць. Для мяне агульны зрэз дэпутата будзе вызначацца па водгуках людзей з глыбінкі, ці ведаюць яны, хто іх народны абраннік. Калі людзі не ведаюць, хто ў іх дэпутат, гэта паказчык таго, што чалавек не працуе. Трэба не проста насіць дэпутацкі значок, а ведаць праблемы знутры. Мне здаецца, што дэпутаты крыху хітрууюць, калі апраўдваюцца, што ў іх нічога няма — ні грошай, ні магчымасцяў, маўляў, «ну што мы можам?». Гэта няправільны падыход. Трэба ўмець размаўляць з людзьмі. Чалавек павінен выказацца, нават калі праблема невырашальная, ён павінен зразумець, чаму. Не пакрыўдзіцца, што яму адмовілі, а зразумець, чаму менавіта так, а не інакш. Вось гэта работа дэпутата. А потым трэба ісці да старшыні выканкама і разам вырашаць, што можна ў канкрэтнай сітуацыі зрабіць, а не думаць, як не зрабіць.

***— Якія мэты і задачы вы ставілі ў сваёй перадвыбарнай праграме?***

— Напісаць праграму не праблема: наабяцай усяго, што людзям трэба, і яны будуць за цябе. Але паабяцаць — гэта яшчэ не значыць зрабіць. Я людзям раю нават не праграмы вывучаць, а глядзець біяграфічныя звесткі: чаго чалавек дабіўся ў жыцці, што ў яго за плячыма. Калі ў яго пэўныя пасады, сям'я традыцыйная, дзеці не па турмах сядзяць, таму што закладкі рабілі, а вучацца і працуюць, значыць, гэты чалавек ужо чагосьці варты. На гэта трэба звяртаць увагу. Праграму нам жыццё будзе дыктаваць. Праблемы рэгіёна я ведаю, але навошта іх пісаць у праграму? Для сябе сфармуляваў два прынцыпы, па якіх буду працаваць я і дэпутацкі корпус той тэрмін, які агавораны заканадаўствам. Першы тэзіс: думаючы пра людзей і краіну, не забывай пра канкрэтнага чалавека. Наша задача — думаць пра глабальнае, але ў чалавека свае праблемы. У кагосьці агароджа ўпала, камусьці дроў трэба прывезці, таму што дзеці далёка жывуць. Здаецца, што гэта не праблема, трэба больш грунтоўным займацца, але з дробязяў складаецца жыццё. Другі тэзіс: лепш быць, чым здавацца. Гэта не мае словы, а паважанага Валянціна Пікуля. Я іх крыху перафразаваў пад сябе. У Пікуля: «Больш быць, чым здавацца, шмат рабіць, але мала выдзяляцца...»

***— У вас хапае часу на літаратуру?***

— А вы ведаеце, чаму ў людзей не хапае часу на літаратуру? Таму што тэлефон усё замяніў. У мяне сэнсарны тэлефон з'явіўся толькі некалькі месяцаў таму. Да гэтага быў кнопкавы, нават эсэмэскі нельга было пісаць. У ваенных такія патрабаванні. Затое быў час на кнігі. Чытаць — звычка з курсанцкіх часоў. З творамі Пікуля менавіта тады і пазнаёміўся. Потым перачытваў. Кожны раз адзін і той жа тэкст успрымаецца па-новаму. Чытаў ужо з ручкай, каб рабіць нейкія запісы.

***— Вы сказалі, што выбаршчыкам трэба звяртаць увагу на тое, чаго чалавек у жыцці дабіўся. Раскажыце, чаго дабіліся менавіта вы?***

— Калі сустракаўся з моладдзю ў 2020 годзе на фоне тых складаных падзей, пытаўся адкрыта: чаго не хапае? Адны казалі, што свабоды, другія — няма перспектыў. Як няма? Я, сын звычайнага прапаршчыка, у 39 гадоў ужо стаў палкоўнікам. Калі ў чалавека ёсць мэта, ён абавязкова яе дасягне. А для гэтага трэба працаваць, а не чакаць манны нябеснай. Ніхто за цябе нічога не зробіць. У мяне яшчэ са школы было жаданне стаць ваенным ідэолагам. Таму паступаў менавіта ў Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча. Вельмі прэстыжная ВНУ, яе яшчэ называлі вучылішчам Варшаўскага дагавора. Там вучылася моладзь з Германіі, Польшчы, Кубы, іншых краін сацлагера. Набор быў вельмі абмежаваны. Пасля школы здаў экзамены на дзве чацвёркі і дзве пяцёркі (па пяцібальнай сістэме. — **Аўт.**), але не прайшоў па конкурсе. Няўдача мяне вельмі засмуціла, але не прыпыніла. Пасля арміі ўсё ж такі паступіў. Але перад гэтым скончыў у Магілёве 98-е вучылішча з чырвоным дыпломам. Гэта давала магчымасць здаваць толькі адзін экзамен. І я яго здаў на «5». ВНУ закончыў з залатым медалём і чырвоным дыпломам, меў права выбару першага месца службы. На той час быў жанаты і меў дзіця. Была магчымасць ехаць за мяжу, але хацелася хутчэй атрымаць чарговае званне. Таму абраў аддалены раён, дзе год, як той казаў, ішоў за два. Разам з жонкай і маленькай дачкой адправіўся ў ваенную акругу ў Запаляр'е. Хутка адбыўся развал Савецкага Саюза, і я вярнуўся на радзіму. Часці скарачаліся, шмат хто сыходзіў у іншыя прафесіі, бо час быў цяжкі, зарплаты ледзь на жыццё хапала. Са 112 чалавек майго курса ў арміі засталіся адзінкі. У 1998 годзе паступіў у Ваенную акадэмію, якую скончыў у 2001 годзе. Акадэмія, дарэчы, знаходзіцца на базе таго самага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча, якое я скончыў. У мяне была мэта, і я ёй не здраджваў. Жонка мяне ўвесь час падтрымлівала. Усё, чаго я дасягнуў, — гэта на 60 % яе падтрымка. І нават на гэту пасаду яна мяне натхніла. Маці жыве пад Магілёвам, у Мастоўскім сельсавеце — маёй выбарчай акрузе. Людзі, якія за мяне прагаласавалі, добра ведаюць мой жыццёвы шлях. І давяраюць мне.

> Трэба ўмець размаўляць з людзьмі. Чалавек павінен выказацца, нават калі праблема невырашальная, ён павінен зразумець, чаму. Не пакрыўдзіцца, што яму адмовілі, а зразумець, чаму менавіта так, а не інакш. Вось гэта работа дэпутата. А потым трэба ісці да старшыні выканкама і разам вырашаць, што можна ў канкрэтнай сітуацыі зрабіць, а не думаць, як не зрабіць.

***— Дарэчы, якія ўражанні складваюцца ад наведвання аддаленых раёнаў вобласці? На што звяртаеце ўвагу пры знаёмстве з мясцовымі дэпутатамі?***

— Стараюся прысутнічаць на сумесных пасяджэннях дэпутацкага корпуса і выканаўчай улады, каб нацэліць абодва бакі на працу разам. Калі падзяляць работу на дэпутацкую і не, нічога не атрымаецца. Павінна быць узаемадзеянне. Мне прасцей размаўляць са старшынямі райвыканкамаў таму, што яны мяне помняць яшчэ па рабоце ваенкама, члена аблвыканкама. Наш губернатар Анатоль Ісачанка быў старшынёй аблсавета і вельмі добра ведае гэту спецыфіку. Мы працуем разам і падаём прыклад раёнам. Калі, вобразна кажучы, дэпутат сабраў людзей на суботнік, задача выканаўчай улады — забяспечыць народ усім неабходным для работы. Шмат што залежыць і ад саміх грамадзян: каля дома не прыбрана, і жыхары чакаюць, калі прыедуць камунальнікі, а прыбяруць, — гэта няправільна. Павінна быць ініцыятыва, жаданне нешта ўкладваць. І тады пытанні хутка будуць здымацца. Калі жадаеце атрымаць добрую дзіцячую пляцоўку, выйдзіце на яе будаўніцтва, а будматэрыяламі забяспечыць улада.

***— Цяпер ідзе вылучэнне кандыдатаў у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. Як кіраўнік грамадскай арганізацыі якія патрабаванні вы ставіце да будучых дэлегатаў?***

— Гэта павінны быць вельмі аўтарытэтныя людзі, у першую чаргу патрыёты. У тым ліку і моладзь. Там сёння хапае аўтарытэтаў. Я не зусім згодны з пасылам, што моладзь — наша будучыня. Моладзь — не толькі наша будучыня, але і сучаснасць. Тое, што можа зрабіць моладзь, мы бачылі ў 2020 годзе. Не было б ніякай будучыні, калі б іх своечасова не прыпынілі. Як жыве краіна, шмат у чым залежыць ад маладых. Таму глядзім, каб ва УНС была і моладзь, і рабочыя, і людзі пры пасадзе. Ахвотных шмат. Ад аморфнага грамадства мы ўжо адышлі. І гэта паказалі апошнія выбары. Людзі зразумелі, што хата з краю заўсёды гарыць першай. Мы павінны рухацца наперад. Трэба не баяцца браць на сябе адказнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Магілёўскага аблсавета.**

# ГРАМАДСКІМІ НАМАГАННЯМІ ЗА СРОДКІ ГРАМАДЫ

**Як у асобна ўзятым сельсавеце талакой ажыццяўляюць цэлыя праекты**

**Знаменскі сельсавет — адзін з самых буйных у Брэсцкім раёне: ён займае амаль чвэрць яго тэрыторыі. У 12 населеных пунктах пражывае каля пяці з паловай тысячы чалавек, функцыянуе шэсць устаноў адукацыі, пяць устаноў аховы здароўя. Вёскі сельсавета адметныя найперш працавітымі людзьмі, тут зарэгістравана шмат індывідуальных прадпрымальнікаў, пражывае многа шматдзетных сем'яў.**

**А яшчэ жыхары вельмі дружныя, на іх рахунку багата сумесных праектаў, рэалізаваных на агульную карысць.**

## Прыпынак для школьнікаў

Першым, з кім пазнаёміў карэспандэнта **старшыня Знаменскага сельскага Савета Сяргей ГАЛАВЕНКА**, быў староста вёскі Страдзеч Канстанцін Сталяроў. Канстанціна Аляксеевіча аднавяскоўцы выбралі старастам шэсць гадоў таму. Праўда, і раней ён заўсёды быў у ліку вясковых актывістаў. Староста — мясцовы жыхар, пра населены пункт ён расказвае так:

— Асаблівасці аграгарадка абумоўлены складам насельніцтва. Тут пражывае 1860 чалавек, прыкладна палова з іх — праваслаўныя хрысціяне, другая палова — евангельскія хрысціяне-баптысты. Усе жывуць дружна, ніякіх непаразуменняў на рэлігійнай глебе ніколі не было. Усе разам працуюць на суботніках, удзельнічаюць у агульных справах. Дастаткова сказаць, што ў нас зарэгістравана 90 індывідуальных прадпрымальнікаў. Грамадзяне займаюцца дрэваапрацоўкай, будаўнічымі работамі, грузаперавозкамі, іншымі відамі дзейнасці. Многія сем'і ўстанавілі цяпліцы, вырошчваюць раннюю агародніну — адным словам, кормяцца з мазаля.

Прыкладам сумеснай работы вяскоўцаў Канстанцін Сталяроў называе ўладкаванне прыпыначнага пункта для дзяцей. Работа яшчэ працягваецца. Вёска Страдзеч вялікая, вучняў збірае школьны аўтобус у трох месцах. Адно з іх знаходзіцца на ўскраіне населенага пункта, дзе ў непагадзь чакаць транспарт асабліва некамфортна. Гэта апошні з трох прыпынкаў, два былі абсталяваны раней. Сабраліся, пагаварылі, вырашылі зрабіць і гэты. Сельгаспрадпрыемства «За мір» выдзеліла матэрыялы, рэлігійная абшчына ўзяла на сябе выраб і ўстаноўку павільёна. Бацькі школьнікаў правялі першы этап добраўпарадкавання. Хутка пляцоўка будзе цалкам падрыхтавана, павільён установлены: і дзецям больш не давядзецца стаяць пад дажджом альбо мокрым снегам.

## Дзіцячая пляцоўка

— Мы бяром на сябе толькі арганізацыю добрых спраў, — дапаўняе Сяргей Галавенка. — Усе прыпынкі, уладкаваныя для школьнікаў, зроблены грамадскімі намаганнямі і на сродкі грамады. Такіх прыкладаў у нас вельмі многа. Днямі вось прыйшоў да мяне галава маладой сям'і Сяргей Хвяшчук з прапановай зрабіць і абсталяваць дзіцячую пляцоўку. Ад сельсавета ён чакае толькі ўзгаднення месца. Рашэннем сельвыканкама мы вызначым і ўзаконім яго, тады людзі прыступяць да работы.

Вядома, сельвыканкам дапаможа з тэхнікай, правільней сказаць, мясцовая гаспадарка па просьбе выканкама выдзеліць машыну, калі спатрэбіцца падвезці габарытнае абсталяванне. Мясцовая ўлада закупіць дэкаратыўныя кусты, каб абсадзіць пляцоўку. Мы дамовімся ў лягасе на пакупку драўніны, каб нарэзаць і зрабіць прыгожую агароджу. Усё астатняе людзі бяруць на сябе. Тыя, хто займаецца дрэваапрацоўкай, гатовы зрабіць казачныя домікі, іншыя забавы для дзяцей. Можна не сумнявацца, што месца адпачынку атрымаецца эксклюзіўным, прыгожым, зручным. Бацькі выйдуць на суботнік, усё як след расчысцяць і ўладкуюць.



Староста вёскі Страдзеч Канстанцін СТАЛЯРОЎ і старшыня сельвыканкама Сяргей ГАЛАВЕНКА каля гандлёвых радоў.

Калі ўзяць толькі квартал жылой забудовы Паўднёвы, там пражывае каля 300 дзяцей. У Страдзечы, дарэчы, налічваецца 85 шматдзетных сем'яў. Вядома, дзіцячая пляцоўка патрэбна. А нядаўна разбіты новы квартал, дзе 83 участкі адведзены пад забудову. Значыць, будуць сяліцца маладыя сем'і, нараджацца дзеці. Так што названая пляцоўка становіцца неабходным элементам інфраструктуры.




На суботнік талакой.

## Мост першай неабходнасці

Адным з самых значных праектаў, рэалізаваных талакой за апошнія гады, быў мост побач з вёскай Дубрава. Ён у 2022 годзе стаў аварыйным, драўляныя элементы прагнілі. Варта сказаць, што Дубрава вёска невялікая, там пражываюць 45 чалавек. Усе камунікацыі праходзілі праз гэты мост. Найбліжэйшы знаходзіцца за тры з паловай кіламетры, такім чынам, з кожнай паездкай даводзілася пераадольваць лішнія сем... Людзі прасілі дапамогі, званілі на прамыя лініі райвыканкама і аблвыканкама. Работу на кантроль, акрамя старшыні раённага выканаўчага камітэта, узяў губернатар.

Пры падліках выходзіла, што кошт будаўніцтва новага аб'екта з праектам, экспертызай пацягне прыкладна на 280 тысяч рублёў. Такія грошы знайсці хутка не выпадае: трэба загадзя закладваць расходы ў бюджэт, чакаць, пакуль сродкі будуць выдзелены. Рашылі не будаваць новы мост, а праводзіць рэканструкцыю старога. Знайшлі тых, хто можа дапамагчы, пралічылі, колькі трэба матэрыялаў. Падрыхтавалі дакументы на аднаўленне моста і зрабілі яго фактычна за два тыдні.

Дапамагло сельгаспрадпрыемства «Астрамечава». Як вядома, у кожнай брыгадзе ёсць свая важніца, на якую ўязджаюць гружаныя машыны са збожжам, іншымі грузамі для працэдуры ўліку. Аснова вагаў у выглядзе металічных пралётаў прадугледжвала вялікія нагрузкі. Іх і паставілі ў якасці пралёту новага моста. Бетонную аснову аддала гаспадарка «За мір». Мясцовыя прадпрымальнікі прыгналі кран, зманціравалі канструкцыю. Для выпрабавання нагрузілі дваццацітонны МАЗ, які не толькі праехаў па мосце, але і пастаяў на ім.

Цяпер праз мост бяспечна ездзіць не толькі легкавікі, але і аўтакрама, аўтамабілі хуткай дапамогі, газавай гаспадаркі, іншых службаў. Што значыць мост для вёскі? Яна і так даволі аддаленая. Летам насельніцтва Дубравы павялічваецца ў некалькі разоў. А наяўнасць моста азначае хуткасць, мабільнасць — адным словам, іншую якасць жыцця. Нездарма ж кіраўнік вобласці ўвесь час трымаў пытанне на кантролі і некалькі разоў цікавіўся на розных нарадах, як ідзе аднаўленне аб'екта.

**Уладзімір ХВАЦІК, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— У Знаменскім сельсавеце мы маем прыклад таго, як многія добрыя справы робяцца талакой, з удзелам розных слаёў насельніцтва. Аб важнасці такой работы нядаўна гаварыў наш Прэзідэнт, прымаючы кадравыя рашэнні. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліваў, што задача ўлады — арганізаваць людзей, стварыць ім умовы, магчымасці для ўдзелу ў добраўпарадкаванні тэрыторый, на якіх яны пражываюць. А тут усё гэта на практыцы. Важна, што сельвыканкам умела наладжвае супрацоўніцтва з сельгаспрадпрыемствамі «Астрамечава» і «За мір». Апошнія таксама праяўляюць клопат пра людзей, якія пражываюць на тэрыторыі, аказваюць пасільную дапамогу. Варта аддаць належнае і вясковым жыхарам, асабліва Страдзеча, якіх не даводзіцца запрашаць для добрай справы двойчы. Яны выходзяць, калі трэба, і сваімі рукамі робяць свой аграгарадок больш утульным, прыгожым, зручным для пражывання.

## Гандлёвыя рады

Усе ведаюць столінскія Альшаны як агурковую сталіцу Палесся. «Мала хто ведае, што Страдзеч — гэта тыя ж Альшаны, толькі ў мініяцюры, — расказвае староста. — Апошняе абумоўлена тым, што ў нас вельмі многа працавітых людзей, бо трымаць і абслугоўваць цяпліцу, каб яна давала належную аддачу, — гэта цяжкая праца, якая пачынаецца ў сярэдзіне лютага. А ранняя вясна — пачатак гарачага сезона ў цяпліцах. Іх гаспадары, як правіла, — шматдзетныя бацькі.

Дзеці з такіх сем'яў па чарзе не ходзяць у школу, каб падтрымліваць тэмпературу ў цяпліцах. З аднаго боку, выглядае няправільным прапускаць заняткі, а з другога — дзеці прывучаюцца да працы, адчуваюць сябе датычнымі да сямейнага дабрабыту і загартоўваюць характары. У рэшце рэшт, той, хто хоча вучыцца, пасядзіць у іншы дзень за падручнікамі і дагоніць аднакласнікаў, — разважае староста. — У гэтых людзей асаблівая жыццёвая філасофія, якая заслугоўвае павагі. Я гутарыў з некаторымі на прадмет якой-небудзь дапамогі. Наша дзяржава падтрымлівае шматдзетныя сем'і. Бацька адной з іх сказаў так: «Перш чым заводзіць вялікую сям'ю, я прадумаў, як буду яе забяспечваць. Дзяцей я не прымушаю прапускаць урокі, яны робяць гэта ўсвядомлена, па чарзе, разумеючы неабходнасць свайго ўдзелу ў справе сям'і». У іх дзеці растуць надзвычай працавітымі, гэта закладваецца сям'ёй. Такія сем'і нярэдка зарабляюць вырошчваннем агуркоў, памідораў, іншай агародніны.

Рэалізоўваюць ураджай па-рознаму. Некаторыя вязуць на рынак у Брэст, іншыя гарады. Але нямала і тых, хто прадае сваю прадукцыю ў вёсцы. І каб людзі не рабілі гэта ў антысанітарных умовах, было ўладкавана тры месцы для гандлю агароднінай. Адны такія рады знаходзяцца ў самым цэнтры Страдзеча. Яны таксама з'явіліся дзякуючы агульным намаганням. Цяпер тут у сезон спыняюцца машыны, пакупнікі набываюць прадукцыю, і мясцовым людзям выгадна.

## Стадыён для ўсіх

Старшыня сельскага Савета Сяргей Галавенка гаворыць, што кожны год у Страдзечы праходзіць шэраг суботнікаў. Напрыклад, на добраўпарадкаванні амбулаторыі працавалі разам, жыхары дапамагалі не толькі асабістым працоўным удзелам, але і тэхнікай. На суботнік выйшла некалькі дзясяткаў чалавек. Такую ж карціну, дарэчы, мы назіралі ў цэнтры аграгарадка побач з царквой у мінулы чацвер. Людзі наводзілі парадак: смецце, адходы грузілі ў прычэп трактара.

Калі едзеш міма могілак, у вочы кідаецца новая агароджа з адмысловай брамай. Яе таксама нядаўна зрабілі прадстаўнікі рэлігійнай абшчыны за свае сродкі са сваім працоўным удзелам.

Цяперашні стадыён каля школы некалі і не быў стадыёнам, а быў пусткай, на якой раслі хмызнякі ды пустазелле. Уладкаваць яго, прывесці ў парадак была ідэя старасты. І рашыў Канстанцін Сталяроў прыцягнуць людзей асабістым прыкладам. Спачатку выйшаў на індывідуальны працоўны дэсант: пачаў расчышчаць, прыбіраць пустазелле, кустоўе. Неўзабаве далучыўся адзін жыхар суседняга дома, за ім другі. Разам работа пайшла весялей. У гэтым адрозненне Страдзеча — тут часам і не трэба прасіць, праводзіць вялікую тлумачальную работу. Людзі бачаць, што нехта робіць добрую справу, і далучаюцца. Такім чынам за год-другі замест пустога лапіка зямлі з'явіўся сапраўдны стадыён з футбольным полем, турнікамі, іншымі прыстасаваннямі для заняткаў спортам. Стадыён, вядома, выкарыстоўваецца школай. Аддзел адукацыі закупіў сетку, слупы для ўладкавання варот. Да справы далучылася мясцовая гаспадарка «За мір», іншыя арганізацыі. Цяпер прыемна паглядзець, як ранкам, вечарам, у выхадныя дні моладзь, школьнікі, дарослыя людзі займаюцца фізкультурай для падтрымання формы.

«Калі пастукаеш, табе адкрыюць, кажа народная мудрасць. Так і ў нас, — працягвае расповед Сяргей Галавенка. — Дапамагчы пачатковай школе ў Прылуках уладкаваць прышкольны ўчастак гульнявым абсталяваннем — не было сродкаў. Звярнуліся да прадпрыемства «Беларуснафта». Яны сабралі грошы сярод супрацоўнікаў. Людзі ўнеслі сімвалічныя ўзносы, а ў выніку атрымалася прыстойная сума, якую паклалі на рахунак аддзела адукацыі з мэтавым прызначэннем. Такім чынам, школа набыла патрэбнае абсталяванне за спонсарскія сродкі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з архіва сельвыканкама.**

# У новым фармаце

## Адзіны дзень дэпутата прайшоў у Гомелі

**По ініцыятыве старшыні Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Алены Алексінай гамяльчане змогуць абраць для сябе зручную форму камунікацыі з народнымі выбраннікамі. Пачынаючы з красавіка, кожную трэцюю сераду месяца без папярэдняга запісу жыхары Гомеля змогуць асабіста сустрэцца са сваім дэпутатам альбо задаць яму хвалюючыя пытанні падчас прамой тэлефоннай лініі.**
**Новы фармат зносін з выбаршчыкамі ў акругах — адзіны дзень дэпутата — упершыню быў праведзены 40 выбранымі дэпутатамі гарсавета. Яны ладзілі сустрэчы ў працоўных калектывах, асабістыя прыёмы грамадзян, «гарачыя лініі».**

У Чыгуначным раёне Гомеля ў ЖЭУ-6 сустрэчу з выбаршчыкамі правяла **старшыня Гомельскага гарадскога савета дэпутатаў Алена АЛЕКСІНА.** Да лідара дэпутацкага корпуса звярталіся з хвалюючымі пытаннямі сферы ЖКГ, цікавіліся сацыяльна значнымі праектамі. Падчас прыёму старшыні гарсавета таксама былі ўзняты пытанні зносу бесгаспадарчых аб'ектаў, будаўніцтва «Усходняга абходу», сезонная паводкавая сітуацыя і іншыя. На ўсе звароты дадзены адказы, некаторыя з іх узяты на кантроль да вырашэння.

— Мы выбралі ЖЭУ як месца для правядзення сустрэчы з гараджанамі, таму што, як правіла, гэтыя арганізацыі знаходзяцца ў жылых дамах, і кожны можа або прыйсці сам агучыць праблемнае пытанне, або перадаць праз супрацоўніка ЖЭУ. Сёння гэта нашы самыя сапраўдныя праваднікі грамадскай думкі, — зазначыла Алена Алексіна.

У Навабеліцкім раёне асабісты прыём грамадзян правёў **дэпутат Гомельскага гарсавета Аляксей ТРАЦЦЯКОЎ.** Першы зварот, прыняты дэпутатам, датычыўся неабходнасці рамонту цэнтральнага ўваходу ўстановы адукацыі. На асабістым прыёме іншая жыхарка раёна папрасіла ўзмацніць кантроль за дарожным рухам на ўчастку дарогі побач з яе домам. Як расказала заяўніца, на вуліцы — гаражы, вялікі паток машын: хацелася б, каб былі прадугледжаны «ляжачыя паліцэйскія». Гэта пытанне таксама будзе перададзена для рэагавання адпаведным службам, запэўніў дэпутат. Паступіў у тым ліку калектыўны зварот ад жыхароў раёна наконт пакінутага будынка былога інтэрната.

У Савецкім раёне Гомеля свой першы прыём у новай якасці правёў самы малады **дэпутат Гомельскага гарсавета ўрач-анколаг-хірург Уладзіслаў ВОЎЧАК.** Прыём прайшоў у РЭУ-23 дзяржпрадпрыемства «Савецкае».

— Раён у нас малады, дамы будаваліся ў 1992—1993 гадах. Людзі актыўныя, неабыякавыя, — паведаміла начальнік адзначанага рамонтна-эксплуатацыйнага ўпраўлення Жанна Сазонава.

Менавіта пры РЭУ-23 Савецкага раёна яшчэ ў 2015 годзе быў створаны паказальны сваёй дзейнасцю камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Сонечны». Да грамадскай работы ў ім прыцягнуты цэлыя сем'і. Намаганнямі членаў камітэта была добраўпарадкавана не адна дваровая тэрыторыя, паглядзець на вынікі гэтай работы як на экскурсію прыязджалі актыўныя гамяльчане з іншых раёнаў.

Уладзіслаў Воўчак падзяліўся, што ў яго планах прапанаваць жыхарам сваёй выбарчай акругі інфармацыйную дапамогу ў плане прафілактыкі захворванняў, у тым ліку злаякасных наватвораў. Магчыма, на думку дэпутата, арганізаваць выязныя прыёмы валанцёраў, вузкіх спецыялістаў.

У свой першы выязны прыём **дэпутат гарсавета, рэктар Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога Артур ПУЦЯТА** сустрэўся з калектывам Гомельскай гімназіі № 51. Як было адзначана, паміж ВНУ і ўстановай адукацыі дасягнута дамоўленасць аб стварэнні на базе 10 класа групы з інжынерным профілем навучання. З новага навучальнага года ў яе плануюць набраць дзесяць чалавек. Навучальную праграму курса распрацавала вядучая ВНУ краіны — БНТУ, але на месцах гэтую працу будуць курыраваць тэхнічныя ВНУ.

— Ва ўніверсітэце ведаюць, што дзверы прыёмнай рэктара адчыненыя заўсёды. Гэты прынцып будзе захоўвацца і для жыхароў акругі, — звярнуў увагу Артур Пуцята. — Лічу, што дзейнасць у гарсавеце дэпутатаў не перашкодзіць кіраўніцтву ВНУ. У нас цудоўная каманда, але і без капітана карабель не застанецца. Сумяшчэнне абавязкаў пойдзе толькі на карысць, бо інтарэсы студэнцтва будуць прадстаўлены напрамую ў важным органе кіравання горадам.


**У адзіны дзень дэпутата ў Савецкім раёне дэпутат Гомельскага гарсавета Уладзіслаў ВОЎЧАК сустрэўся са старшынёй МЖК «Сонечны» Уладзімірам МАКАРАВЫМ і начальнікам РЭУ-23 дзяржпрадпрыемства «Савецкае» Жаннай САЗОНАВАЙ.**

Падчас наведвання гімназіі дэпутат, у тым ліку, азнаёміўся са станам стадыёна і міні-футбольнага поля, адкрытага тут у 2013 годзе. Гэты аб'ект сёння не ў лепшым стане: тэрміновай замены патрабуюць штучнае пакрыццё поля і агароджа.

— Праблему зразумеў, абавязкова пастаўлю гэтае пытанне перад гарсаветам, — запэўніў дэпутат.

Па яго словах, адзіны дзень дэпутата — цікавы і карысны досвед: «Зразумела, што не ўсе пытанні вырашаюцца адразу, дэпутат — далёка не чараўнік. Але тут важная яго пазіцыя — як мінімум прыкласці ўсе намаганні, каб людзей пачулі».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# АД ГОДА ЯКАСЦІ — ДА ГОДА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ БРЭНДАЎ?

## Аб чым разважалі ўдзельнікі абласнога конкурсу «Я — заканадаўца»

**У Гродзенскай вобласці падведзены вынікі творчых работ па тэме беларускага заканадаўства. Найлепшымі ў трох намінацыях прызнана шэсць праектаў. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў прайшла ў Шчучыне з удзелам прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса, выканаўчай улады, педагогаў, студэнтаў і школьнікаў.**

Абласны конкурс «Я — заканадаўца» заснаваны асацыяцыяй мясцовых Саветаў пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў і праходзіць другі раз. Па словах арганізатараў, было прадстаўлена больш як шэсцьдзясят работ па трох тэмах. З іх журы выбрала шэсць найбольш крэатыўных і глыбокіх.

Свае работы фіналісты прадставілі ў музеі сімволікі СШ № 2 Шчучына. Дарэчы, адна з намінацый была прысвечана 30-годдзю Канстытуцыі Беларусі. Падчас прэзентацыі сваіх работ студэнтка Мірскага дзяржаўнага каледжа Марына Русак зазначыла, што станаўленне і развіццё краіны складваецца з невялікіх, на першы погляд, поспехаў



і дасягненняў народа. І тут важна падпарадкоўвацца адзіным правілам паводзін, законам, якія забяспечваюць жыццядзейнасць спакойнага, здаровага і стабільнага грамадства. Канстытуцыя для людзей — гэта як камертон для музычных інструментаў, — лічыць дзяўчына.

Па словах **старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алены ПАСЮТА,** значная колькасць работ была даслана па тэме «Хто ён — мой дэпутат?». Відавочна, што гэта тэма цікавіць сучасную моладзь, асабліва падчас шырокай электаральнай кампаніі, якая адбылася ў другой палове сакавіка.

— Маладыя людзі сустракаліся з дэпутатамі падчас дыялогавых пляцовак, на форумах і пасяджэннях Маладзёжнага парламента. Таму і работы атрымаліся змястоўныя і глыбока прадуманыя. Магчыма, удзел у конкурсе стане для некаторых фіналістаў крокам у будучую дэпутацкую дзейнасць, — выказала меркаванне Алена Пасюта.

Дык які ён — наш дэпутат? Фіналістка конкурсу Дар'я Барыш, якая вучыцца ў гімназіі Шчучына, лічыць, што дэпутат павінен жыць паводле «залатога правіла», гэта значыць, ставіцца да сваіх выбаршчыкаў так, як хоча, каб ставіліся да яго. «Дэпутат не мае права быць фальшывым і двудушным», — рэзюміруе Дар'я.

А вучань Трабскай сярэдняй школы Іўеўскага раёна Глеб Мікша прыкладам асобы дэпутата лічыць свайго бацьку — адказнага і прыстойнага чалавека. Па яго шляху марыць пайсці і сённяшні школьнік. У будучым ён плануе звязаць сваё жыццё з малой радзімай і рабіць усё магчымае для развіцця свайго аграгарадка.

Таксама цікавасць у шырокай аўдыторыі выклікала тэма «Я прапаную зрабіць наступны год Годам...»

У гэтай намінацыі было выказана нямала ідэй. Найбольш слушнымі, на думку журы, сталі работы двух фіналістаў. Акцэнт рабіўся на патрыятычным складніку прапановы. Напрыклад, вучань Воранаўскай сярэдняй школы Яўген Вараб'ёў прапануе ад Года якасці перайсці да Года нацыянальных брэндаў. У Беларусі выпускаецца шмат прадукцыі, якой можна ганарыцца. Яна атрымала шырокую сусветную вядомасць. Але такой прадукцыі можа быць яшчэ больш.

Свае бачанне ў гэтай намінацыі выказаў дыпламант конкурсу, вучань Пескаўскай школы Мастоўскага раёна Алег Мандзік. Ён лічыць, што павінен быць Год адказнасці, каб усе адчувалі адказнасць не толькі за стваральную працу, але і за незалежнасць краіны, а пры неабходнасці маглі яе абараніць.

Конкурс атрымае працяг і ў далейшым, паведамілі яго арганізатары. Бо гэта не толькі спаборніцтва праектаў, але і далучэнне моладзі да жыцця краіны, ўсведамленне сваёй ролі ў грамадстве.

— Конкурс «Я — заканадаўца» вельмі важны і патрэбны як для саміх удзельнікаў, так і для дзяржавы, — падкрэсліў **старшыня Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў Анатоль НІКІЦІН.** — Па-першае, моладзь будзе глыбей ведаць законы краіны. Па-другое, удзельнікі праекта змогуць на сваім узроўні данесці гэтыя законы да сваіх равеснікаў, бацькоў. Ну і галоўнае, усім будзе больш камфортна жыць у краіне, законы якой адпавядаюць спадзяванням усіх яе жыхароў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота dzyannica.by.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праcп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 10.904. Нумар падпісаны ў 19.30 19 сакавіка 2024 года.**

На светлы ўспамін

# ПРА МІКОЛУ МЯТЛІЦКАГА, ПРА ЧАС І КРЫХУ ПРА НАС

**З Міколам Мятліцкім мы знаёмыя з канца 70-х гадоў мінулага стагоддзя, а сябравалі з пачатку 80-х. У нас з Людмілай Рублеўскай Мікола быў сватам на вяселлі, з ім ездзілі ў Пугачы да маіх бацькоў. Мы разам выступалі ў школах і бібліятэках. І я шмат разоў, калі яшчэ быў халасцяком, начаваў у Міколы з Ірынай. На маіх вачах раслі і выраслі іх дзеці — Ганначка і Валера. І, калі ўспамінаць усё, што мы разам перажылі, перадумалі, перамарылі, дык трэба напісаць цэлую кніжку. І, каб напісаць, трэба шмат часу. А яго цяпер якраз і няма: 20 сакавіка 2024 года Міколу Мятліцкаму, заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэату прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» ды ўладальніку іншых літаратурных узнагарод, было б 70 гадоў. На жаль, будзем святкаваць без юбіляра. Няхай мне даруе Мікола Міхайлавіч, што, успамінаючы яго, скарыстаюся тым, што ўжо было запісана ў маім дзённіку. Спадзяюся, чытачам «Звязды» будзе цікава адчуць жывы подых часу.**



1981 год. Каралішчавічы. Семінар маладых літаратараў — Мікола Мятліцкі, Ала Канапелька, Віктар Шніп.

**23.07.1986.** З Міколам Мятліцкім паехаў на дачу. Ён прывёз Вялюгіну газеты. Пагаварылі. Бачыліся з Леанідам Дайнекам і Алесем Савіцкім. Міколава дача стала, як панскі дом. Ехалі назад з Васілём Гігевічам...

**30.10.1987.** Паехаў у політэхнічны інстытут выступаць. Калі падышоў — ужо былі Вольга Гурская з Міколам Мятліцкім. Хуценька пайшлі на чацвёрты паверх у бібліятэку, дзе нас ужо чакала недзе жанчын сорак і адзін хлопец. Нашы кніжкі хадзілі па руках. Мікола гаварыў і чытаў вершы болей паўгадзіны. За выступленне падарылі нам па букеце кветак.

**28.11.1988.** Вечар. Гатую гарбату. І раптам чую голас Люды: «Ідзі, нехта тэлефануе». Падымаю трубку. Галубовіч. Не разабрацца, што ён гаворыць. Пытаюся: «Адкуль звоніш?» — «З Мінску, ад Мятліцкага. Заўтра ідзеш?» — «Куды?» — «На пахаванне...» — «Якое пахаванне?..» — «Што, і ты не ведаеш? Янішчыц у пятніцу... Я ў Маскве ведаю, а вы тут, у Мінску, нічога не ведаеце. І Асташонак не ведае...» (...) «Добра, што вы ёсць, хлопцы», — казала пра Мятліцкага і мяне Янішчыц. Скардзілася, што няма сяброў, што ўсе зайздросцяць, гатовыя з'есці. На што я сказаў: «У нас на працы добры калектыў, як нідзе». — «Хлопцы харошыя, я з імі сябе адчуваю як дома». — «Вось пойдзеце на працу і супакоіцеся». — «Добра. Добра, што ты прыйшоў. Пачаставала б гарэлкай. Ды цяпер няма. Сазвонімся пасля. Я вас з Міколам Мятліцкім запрашу асобна. Пасядзім, пагамонім...»

**19.12.1988.** У суботу з Мятліцкім і Вадзімам Спрынчанам ездзілі да Міколы на дачу. Абвязвалі яблынькі ад зайцоў. Надвор'е было немарознае, ціхае. Нагаманіліся, але і намерзліся. Вадзім паехаў раней — яму трэба ў басейн. А мы яшчэ пакапаліся ў снезе. Грэліся каля каміна, ды так, што ў Міколы загарэўся чаравік. Пасмяяліся.

**14.01.1989.** У нас дома быў Мікола Мятліцкі. Прынёс для Люды букет. Рукапіс яе ён падрыхтаваў да друку. Хваліў, віншаваў, жартаваў. Затым Мікола ўгаварыў мяне паехаць на дзень нараджэння да Вадзіма Спрынчана. Я ўзяў пляшку добрага віна і каробку цукерак. Мікола выкупіў карціну за 46 рублёў. У Вадзіма хораша пасядзелі. Калі сабачку далі костку і той пачаў грызці яе, Мікола пажартаваў: «Прыемна чуць, як трашчаць косці нашых ворагаў!..»

**29.01.1989.** Быў у Мятліцкага. Закончылі складанне рукапісу зборніка для «Школьнай бібліятэкі». У Міколы выйшаў сігнал «Горкага выраю». Задаволены, як хлапчук.

**15.02.1996.** Люда збіраецца перайсці на працу ў «ЛіМ». Учора да нас у рэдакцыю прыходзіў Мятліцкі. Пасля аперацыі ходзіць з кавенькай, але па-ранейшаму жартуе.

**6.09.2010.** Па дарозе ў Хойнікі, на Дзень беларускага пісьменства, аўтобусы з гасцямі з Мінска на мяжы Гомельскай і Магілёўскай абласцей сустрэла міліцыя. Нас суправаджалі па дарозе, абапал якой, недзе за кіламетраў пяцьдзясят да сёлетняй сталіцы Дня беларускага пісьменства, было на што паглядзець. Гэта і плакаты з віншаваннямі, і вялікія самаробныя лялькі ў нацыянальных строях, і цытаты з твораў класікаў беларускай літаратуры. Праязджаючы, побач з Глінішчамі можна было ўбачыць расфарбаваны аўтобусны прыпынак з вялікім намаляваным партрэтам Івана Мележа. На наступным прыпынку быў партрэт Якуба Коласа. На трэцім — Міколы Мятліцкага. А далей былі прыгожыя вобразы палешчанак і буслоў...

**30.01.2017.** Выдаём для публічных бібліятэк амаль 500 старонак вершаў Міколы Мятліцкага. Мікола вельмі задаволены тамінай і ні грама не сумняецца, што яе будуць чытаць. Гаворачы пра літаратуру, Мікола згадаў, як ён у свой час хадзіў у Акадэмію навук да N. Той адразу ж заявіў: «Сучаснай беларускай літаратуры няма. Быў адзін паэт, і той прапаў!» Мікола не спалохаўся вялікага начальніка і пачаў даказваць, што літаратура сучасная ў нас ёсць. І даказаў, і была падпісаная дамова з «Полымем», дзе публікацыі сталі ўлічвацца пры абароне кандыдацкіх дысертацый.

**23.02.2017.** Сёння нашу дачку Вераніку з малым Кастусём выпісалі з 7-й бальніцы «Маці і дзіця». Людміла ездзіла на выпіску. Прыехала. Глядзіць, што побач нейкая знаёмая жанчына. А гэта жонка Міколы Мятліцкага Ірына. Сёння якраз у адзін час з Веранікай выпісалі іх Ганну з дачкой Надзяй. Унучка Мятліцкіх крыху старэйшая за нашага ўнука. Міколу цяпер будзе радасці і натхнення на дзіцячыя вершы.

**23.05.2018.** Быў у Доме Дружбы, што на вуліцы Захарава. Удзельнічаў у прэзентацыі кнігі «Начныя птушкі» народнага паэта Татарстана Роберта Мінуліна, што выйшла ў «Мастацкай літаратуры» ў перакладзе Міколы Мятліцкага. Усё было добра. Дзякуючы Міколу, было сапраўднае свята паэзіі і сяброўства.

**1.11.2019.** Нядаўна выйшаў з друку творчы альбом народнага мастака Беларусі Івана Міско. Прэзентацыя адбылася ў кнігарні «Светач». Выступілі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Мікола Мятліцкі, паэтэса Аліна Легастаева, паэт-песеннік Фёдар Баравой. Іх запрасіў сам Іван Якімавіч. Ён робіць скульптурны партрэт Міколы.

**5.02.2021.** Раніцай было 16 градусаў марозу. У Доме прэсы прэзентавалі кнігу «Іван Мележ. Пясняр Палесся», што выйшла ў серыі «ЖЗЛБ». З выдавецтва ездзілі з Бадаком і Дайлідавым. Да нас далучыўся Мікола Мятліцкі, на якім уся прэзентацыя і трымалася.

**16.02.2021.** Раніцай было 20 марозу. Бязветрана. Снег змерз, і па ім можна хадзіць, як па страсе. А дзясятай засвяціла сонца. Мікола Мятліцкі пасля ўскладання кветак да помніка Наваі захварэў. Кажа, што ў яго бранхіт.

**16.09.2021.** Усё больш халадае. Восень бярэ пад свой кантроль наша жыццё. На працы клопатаў хапае. Мікола Мятліцкі прыслаў абяцаныя ўспаміны. Кінуў вокам. Цікава. Будзем друкаваць і чакаць ад Міколы працягу.

**17.09.2021.** Прачытаў для «Полымя» аповед-успамін «Сполахі даўніх зарніц» Міколы Мятліцкага. Чытаецца, як п'еца добрае віно. Не магу не прывесці цытату:

*«У 2010 годзе на Свяце пісьменства, якое прайшло ў Хойніках дзякуючы здзейсненаму ў айчыннай літаратуры праслаўленым земляком Іванам Паўлавічам Мележам, да мяне падышла пажылая жанчына. Калона ўдзельнікаў свята пасля завяршэння ўрачыстасці адкрыцця ўжо рухалася пад шаты старавечнага Празараўскага парка ў наваствораны краязнаўчы музей і да эстрадных пляцовак, дзе меліся выступаць і мы, пісьменнікі. На рагу цэнтральнай вуліцы каля двухпавярховага будынка пажыццёва памятнага мне ўнівермага, дзе зараз месціцца «дом рамёстваў», жанчына-зямлячка і звярнулася да мяне:*

*— Міхайлавіч, даўно яшчэ вас, калі матка мая жыла, хацела дужа пабачыць. Ды не выходзіла. А сягоння вот сам бог, як кажуць, у рукі паслаў! Ці ведаеце вы, што ў нашай Бабчынскай школе ў 1930 годзе быў Янка Купала?*

*— Не, не ведаю. Ніколі не чуў. Дый ці магчыма такое?*

*— Матка мая, светлай памяці, была на гэтай сустрэчы. Каб ад каго іншага пачула, дык і сама б усумнілася. А то ж ад роднай маткі. А яна небыліц не любіла. Адукаваная. Настаўніцай працавала».* Словам, у вёсцы Бабчын, дзе нарадзіўся Мікола Мятліцкі, бываў Янка Купала. Шкада, што Бабчын цяпер у чарнобыльскай зоне.

**22.11.2021.** Дзень выдаўся сонечным, але сумным. Патэлефанаваў Віктар Праўдзін і захацеў даведацца ў мяне, як там стан Міколы Мятліцкага, які трапіў у бальніцу. Я пра Міколу нічога не ведаў. Патэлефанаваў жонцы Міколы Ірыне. Яна ў слязах. Мікола адчуў сябе кепска 10 лістапада. Кашаль, тэмпература. Зрабілі тэсты. У Міколы і ў Ірыны знайшлі карону. У сына Валеры тэст адмоўны. Ірына і цяпер кашляе. Лечыцца дома. У мінулы панядзелак Мікола адчуў сябе лепей, павесялеў, нават добра паеў. І тут праз некалькі дзён стала яму зусім кепска. Кісларод у крыві ўпаў. Паклалі Міколу ў другую бальніцу, дзе быў Шабовіч і памёр. Пра Шабовіча Мятліцкі не ведае. Адзін раз Мікола патэлефанаваў Ірыне і сказаў, што яго да сябе кліча Ганад Чарказян. З суботы на нядзелю Мікола ўжо не змог сам дыхаць, адмовілі ныркі і пячонка. Словам, кепскія справы з Міколам.

**23.11.2021.** Па абедзе выпаў снег, падсвечаны праз аблокі, як праз гардзіны, сонцам. Навокал стала прыгожа, але нявесела. У галаве — Мікола Мятліцкі. І калі спаць клаўся, і калі ноччу прачынаўся, і раніцай, і на працы ўвесь дзень. Вельмі шкада, што такая з ім бяда надарылася. Не паспеў Мікола напісаць цалкам свае ўспаміны, якія планаваў і якія з прыспешваў для «Полымя». Напісаў пра дзяцінства, універсітэт і, калі тэлефанаваў, паведаміў мне, што дапісвае пра «ЛіМ». Далей павінна было б пра «Мастацкую літаратуру» і пра «Полымя». Можа яшчэ і папраўціца. Дай бог! Але шанцаў амаль няма... Не здавайся, Мікола!

**25.11.2021.** Чацвер. Як там Мікола? Учора нашы дзяўчаты тэлефанавалі дамоў Мятліцкім. Ніхто не адказаў. Магчыма, Ірына таксама ў бальніцы. Калі я з ёй размаўляў, дык яна вельмі страшна кашляла, як у бочку».

**27.11.2021.** Субота. Лёг спаць недзе ў гадзіну ночы. Прачнуўся, калі яшчэ не было чатырох. Спрабаваў заснуць, не змог. Напісаўся верш «Прыпыніся на хвілю». Лёгка, быццам ён ужо быў напісаны, а мне заставалася толькі ўспомніць. А шостай пайшоў з Міёнай на Мухлю, хоць і не планаваў так рана.

З Міёнай дадому вярнуліся мокрыя, як трава, па якой гулялі. Паснедаўшы, лёг паспаць. А дзясятай прачнуўся. І мне стала сумна-сумна, як на могілках. І тут патэлефанавалі: а шостай раніцы памёр Мікола Мятліцкі... Каранавірус...

**2.12.2021.** Ранкам, калі Алесь Бадак прыйшоў на працу, даведаўся, што Мікола Мятліцкі ў рэанімацыі напісаў свой апошні верш. Яго аддалі Ірыне, а тая пераправіла Алесю Карлюкевічу. Вось апошні верш Міколы.

***У РЭАНІМАЦЫІ***

*Нада мной схілілася шкляная маска.*
*З-пад яе позірк вачэй карых, вабна-спакусных.*
*— Прачынайцеся, калі ласка! —*
*Прамовілі прыгожыя, але прыхаваныя, вусны.*

*Толькі вочы. І разлёт чорных тоненькіх броў.*
*— Вам трэба здаць кроў!*
*— Як імя ваша, вочы і бровы?*
*— Вікторыя!*

*І грудзі мае выдыхнулі кавіднахворыя:*
*— Віват, мая Перамога, — Vikto-ria!*

18 лістапада 2021 г.

**3.09.2023.** На Дзень беларускага пісьменства ў Гарадок з Шаркаўшчыны прыехаў мой сябра Міледзій Кукуць. Крыху паразмаўлялі. Пажартавалі. Міледзій узгадаў, як ён упершыню прыйшоў у рэдакцыю «Полымя» да галоўнага рэдактара, да Міколы Мятліцкага. Зайшоў у кабінет. Мікола, убачыўшы, што незнаёмец зайшоў да яго не зняўшы шапку, узвіўся: «Вы ведаеце, куды прыйшлі? Вы прыйшлі ў «Полымя», а «Полымя» — гэта храм беларускай літаратуры! Зняць шапку!» І Міледзій зняў шапку. Такім было знаёмства Кукуця і Мятліцкага. Праз нейкі час Мікола і Міледзій сталі добрымі знаёмымі, і цяпер Міледзій з усмешкай успамінае тую першую сустрэчу з Мятліцкім.

**29.10.2023.** У 1996 годзе ў Міколы Мятліцкага ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла «Бабчын: Кніга жыцця», за якую ён пазней атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. У Доме літаратара была прэзентацыя, і Мікола ўсім, хто прыйшоў на яе, падарыў выданне. Нам з Людмілай падпісаў па кніжцы. «Дарагая Людміла! Чытаю ўсё, што Ты творыш. Жадаю, каб за Паэзіяй не забывала пра мужа. Ён варты тваёй увагі. Мікола Мятліцкі. 6 лістапада 96» — так Мікола напісаў Людміле, а мне вось так: «Дарагі Віктар Шніп — ад душы, з сэрцам дарую табе Бабчын, як Паэту з вялікай літары. Люблю вас, Шніпы — эпохі нашай шыпы. Мікола Мятліцкі. 6 лістапада 96».

А чатырма гадамі раней Мікола падпісаў мне кніжку «Палескі смутак» (1991):

*«Віктар!*
*З валожынскай курганнай стараны*
*К табе, мой друг, брыдуць начамі сны.*
*Дарогу ім — натхненнем заступі,*
*Ў паэзіі — час зорны не праспі.*
*Мікола Мятліцкі. 23.02.1992 г.»*

***БАЛАДА МІКОЛЫ МЯТЛІЦКАГА***

(20.03.1954—27.11.2021)

*Ты ідзеш дзяжурным па планеце,*
*Рыфмамі мацуеш кожны крок,*
*І табе твой Бабчын з неба свеціць,*
*І найболей — з хаты аганёк,*
*Дзе народжаны быў ты, дзе маці*
*Для цябе спявала ў час дажджоў.*
*І жыве ў табе, як птушка, шчасце,*
*І жыве ў табе, як верш, любоў.*
*Ты ідзеш. Твой човен за табою*
*Земляні нясуць, нібы твой дом.*
*І туман, як вечнасць, над ракою,*
*І трава напоўнена святлом*
*Продкаў нашых і твайго Палесся.*
*Ты ідзеш і ведаеш, куды.*
*І анёлы лётаюць над лесам,*
*Сеюць кропелькі жывой вады,*
*Каб твой лес не высах і ніколі*
*Не зрабіўся чорнаю сцяной.*
*Ты ідзеш па небе, як па полі,*
*І натхненне, як душа, з табой.*
*І бліжэй, бліжэй твой любы Бабчын,*
*І цячэ, як Млечны Шлях, рака.*
*І ўсё чуеш ты, і ўсё зноў бачыш,*
*І ўсё пішаш — аж баліць рука...*
27.11.2021

**Віктар ШНІП.**

# НА ПАЛЯВАННЕ ЯСЬ ХАДЗІЎ,

## як заўсёды, з «Ніканам»...



**...Кажуць, той, хто не мае «крузака» (дарагой, прадстаўнічай машыны), марыць яго купіць, хто мае — не ведае, як пазбавіцца (10—15 літраў бензіну на 100 вёрстаў гэта, згадзіцеся, шмат!).**
**Прыкладна тое ж і з фотатэхнікай: самы надзейны спосаб зарабіць на ёй — гэта прадаць... Што разумееш пасля, а спачатку (з досведу калег) шмат чытаеш, вучышся, сочыш за работай мэтраў, стараешся здымаць — прыроду, людзей...**
**І вось ім падчас здымкаў чаго не абяцаеш!.. «Птушачка» і «сыр» — мінулае стагоддзе. Цяпер, для таго каб выклікаць усмешкі, прапануюцца сапраўдныя галаваломкі. Адзін з фотамэтраў, напрыклад, прасіў: «Увіцце: вам казалі нешта важнае, а вы — не пачулі. Што будзеце рабіць?» — «Як гэта што? — не разумеў чалавек ці цэлая кампанія. — Скажам: прабачце, калі ласка. Паўтарыце яшчэ раз, бо мы не пачулі». — «А карацей — атрымаецца?» — пытаў калега.**
**І адказы, вядома ж, чуў, праўда, без чароўных слоў «прабачце» і «калі ласка» альбо нават па-нямецку ці па-французску...**
**«Не, найкарацей — па-нашаму, па-беларуску!» — сцвярджаў калега, тут жа вымаўляў бабуліна: «Га-а-а?!» і «лавіў» такія ўсмешкі!**
**Яны да сёння на здымках. І ў яго іх безліч!**

У спадара Андрэя Феакцістава, трэба разумець, таксама, бо вершаў пра яго вавёрку (яна ж — векша... Не блытаць з белачкай) напісана вельмі шмат. Чытаем! А заадно выбіраем найлепшыя подпісы да здымка.

«Гэты звярок вывучае фотапастку, — піша **спадарыня Раіса Ісакава з в. Сласцёны Чавускага раёна**. — Адкуль я ведаю? Ды не мела неяк клопату — купіла сабе казу. Карміла і даглядала яе, звадзіла на спатканне да козліка, дзвюх козачак ад яе прыняла — бадзёрых, вясёлых і такіх памаўзлівых! Ну ніяк не адвучыць было ад мамчынай цыцкі! А прамарудзіш, мне сказалі, — малака не ўбачыш...»

«Інтэрнэт дапамог, — распавядае далей чытачка, — па яго падказцы пашыла я казе адмысловы ліфчык (два матузкі завязваюцца на спіне, два — на ашыйніку)... Выпусціла малых — яны вобсас да мацi! І так, і сяк ды... ніяк: не могуць ні падступіцца, ні адступіць: Лялька, бачу, скок матулі на спіну. Я не зразумела, чаго? А яна, бачу, спрабуе зубкамі матузкі мае развязаць, каб дарваецца-такі да малачка... У вавёркі са здымка, напэўна, іншыя мэты?..»

Напэўна.

Але ж спачатку не пра іх. Найперш — і хочацца, і трэба пагадзіцца з **сужэнцамі Астроўскімі з Мінска**:

*Найчасцей*
*сядзім мы дома...*
*І тады нам невядома,*
*Што ў лесе, што ў полі,*
*Як жыве звяр'ё на волі?*
*Але ж добра, калі ёсць,*
*Той, хто ўбачыць*
*прыгажосць*
*І пакажа іншым людзям,*
*Што дзе ёсць,*
*было і будзе.*

Ці альбо, на думку **мінчанкі спадарыні Любові Чыгрынавай**, падыме з канапы, выцягне з дому, бо

*Тут, на здымку,*
*не загадка,*
*Тут — «чытаецца» намёк:*
*Калі штосьць*
*не вельмі гладка,*
*Па настрой ідзі ў лясок.*

А ўжо там, на думку **спадара Юрыя Вінаградава з Докшыцкага раёна**, чаго толькі не ўбачыш:

*— Ой, вавёрка!*
*Прыгажуня!*
*Ты — як сонечны*
*прамень!..*
*Зранку ўбачыў —*
*не сумуеш,*
*Бо ўспамін —*
*на цэлы дзень!*

І сапраўды: мае чалавек рацыю! Спадзяемся, нашы чытачы не будуць пытацца, адкуль яна?.. Іх (як і вавёрку), паводле **спадарыні Ісакавай**, займае іншае:

*Што за цацка тут такая?*
*І каго ж яна чакае?*
*...Хутка цяміць акрабатка:*
*Вой,*
*дык гэта ж фотапастка!*
*Грэх яе тут пакідаць —*
*Трэба ў дупло забраць.*

У гаспадарцы, як вядома, усё можа спатрэбіцца. А вось для чаго? На здымку, паводле **спадара Вінаградава:**

*XXI стагоддзе*
*І бландзінкі*
*на прыродзе —*
*То з бярозкі, то з асінкі*
*Яны робяць*
*сэлфі-здымкі...*

Трэба разумець, забаўляюцца, прычым — па-сучаснаму, бо, як лічыць **спадар Матошка з Расоншчыны**:

*Вось і ў лес прыйшоў*
*прагрэс:*
*У вавёркі інтарэс,*
*Каб забаву мелі дзеткі,*
*Фоткі выкласці ў «сеткі»,*
*Хай калегі і сябры*
*Лайкі ставяць у бары.*

Колькі іх будзе, ніхто не ведае, бо «з малога раўчука пачынаецца рака» і з драбязы, на думку **спадара Вінаградава**, свая, уласная справа:

*Рыжая гарэзніца*
*Па ствалах гуляла,*
*На яліне камеру*
*Неяк адшукала...*
*Ёй цяпер*
*дазвол бы ўзяць:*
*Можна бізнес адкрываць.*

А вось наколькі сумленны — ёсць пытанне (у **спадарыні Ісакавай**). І нават не адно:

*Куды вясной*
*мядзведзь хадзіў?*
*Ліса*
*з кім абдымалася?*
*І адкуль гэта сава*
*Дамоў адна вярталася?*
*...Фотапастка —*
*вам скажу —*
*Просты шлях*
*для шантажу.*

А найперш, як лічыць **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды**, — сродак для выхавання:

*Парк Чалюскінцаў вітае*
*Тых, хто ўмее адпачыць!*
*А вавёрачка здымае,*
*Каго трэба «палячыць»:*
*Там віно п'юць*
*падшыванцы,*
*Там цюльпан*
*зрывае дзед,*
*Каб яго ўручыць*
*каханцы...*
*Дзіўны гэты белы свет!*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Што праўда, тое праўда: ён нават дзівосны! На такі — глядзеў бы і глядзеў, бо колькі таго жыцця?! Многія не паспяваюць нават дрэва пасадзіць, а вось нашкодзіць ды насвінячыць...

«На заслужаны адпачынак я выходзіў даўно, — прыгадвае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. — Тады ў нашым Пастаўскім лясгасе толькі пачыналі з'яўляцца відэакамеры для выяўлення пажараў. Фотапасткі з'явіліся пазней, але ж я ведаю, што яны аснашчаны спецыяльнымі датчыкамі, якія беспярэпынна рэагуюць на рух: варта ім спрацаваць, — на камп'ютар у лясніцтве або на мабільны тэлефон супрацоўніка паступіць адпаведны сігнал, а значыць, да браканьераў ці парушальнікаў парадку накіруецца лясная ахова».

Адкуль рыфмаванае (ад **спадара Дзяніса Андросіка з Узды**):

*У лясгасе*
*пад Мар'інай Горкай*
*Ёсць у штаце*
*фатограф-вавёрка:*
*Не касых,*
*не рагатых здымае, —*
*Тых,*
*хто смецце*
*паўсюль раскідае...*
*Бачыў сам,*
*бо хадзіў па ўзгорках:*
*Чыста ў лесе*
*пад Мар'інай Горкай!*

Хоць недзе... Гэта, згадзіцеся, добрая навіна! Яшчэ адна — ад **спадара Мікалая Касмачэўскага з Наваполацка**:

*Можна верыць*
*ці не верыць —*
*Шмат хто ў лесе*
*браканьерыць:*
*То страляюць,*
*то «балююць»...*
*Ды й на іх цяпер*
*палююць:*
*Глянь — вавёрка мае ўжо,*
*Няхай фота — ды ружжо!*

Пытанне (у **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы**), якое — канкрэтна?

*«ФЭД», «Зеніт»,*
*а можа, «Зоркі»?*
*Што ж*
*спадручней для вавёркі?*
*Хоча якасна здымаць, —*
*Лепш са «Змены»*
*пачынаць.*

Напэўна ж, было? Бо згаданую тэхніку цяпер хіба ў музеях знойдзеш, ці недзе ў кладоўках — далёка зайшоў прагрэс:

*Бач, вавёрка ўжо здымае,*
*Што, дзе робіцца ў лясах...*
*Хто парадак парушае,*
*Нарываецца на штраф.*

Альбо (на думку **спадара Валерыя Гаўрыша**) — на так званыя медныя трубы:

*Лес вясновы,*
*лес сасновы...*
*І прыбор там нейкі новы?*
*Глянуць*
*скокнула гімнастка:*
*— Што такое?*
*Ці не пастка?*
*Аб'ектыў між тым —*
*адкрыты,*
*Вось і стала знакамітай.*

Ну як жа — здымак у газеце... Тысячы людзей яго ўбачылі, сотні — падумалі, што б гэта значыла, дзясяткі — яшчэ і напісалі... (Асобныя, праўда, забыліся на розніцу ў нашай мове паміж вавёркай і «белкай» (яна ж — белая гарачка.)) Успомнілі хіба **сужэнцы Астроўскія**:

*Людзі круцяцца наўкола,*
*Як вавёрачкі ў колах...*
*(Хто — ля пляшачкі*
*з гарэлкай, —*
*Рызыкуе аж да «белкі»*
*У хуткім часе*
*«дакруціцца»)...*
*Ну а векшы —*
*працаўніцы,*
*Прыгажэй —*
*не адшукаць!*
*Значыць,*
*трэба іх здымаць:*
*Без адкладу, без гаворкі,*
*Бо вавёркі — фотазоркі!*

Хто б спрачаўся, — мы не будзем. Слова хіба што **спадару Аляксандру Матошку**: «Звярок на здымку атрымаўся ўдала! Але ж, калі прыгледзецца, то кадр — з так званых пастановачных...» Што іншымі словамі:

*Андрэю веры я не даў —*
*Хітрэе трохі Феакцістаў:*
*Вавёрцы семечкі паклаў*
*Таму і здымак*
*выйшаў чысты!*

Амаль пра тое ж радкі **спадарыні Чыгрынавай**:

*На паляванне*
*Ясь хадзіў,*
*Як заўсёды, з «Ніканам»:*
*І вавёрку пакарміў,*
*І заданне выканаў!*

Трэба разумець, што «Нікан» — то-бок фотаапарат — у Яся быў не адзін: адзін — застаўся на дрэве. Чаму? Радкі без подпісу:

*На паляванне*
*Ясь хадзіў,*
*З сябрамі,*
*як заўсёды, піў —*
*Забыўся фотаапарат...*
*Вавёрчын муж —*
*глядзіце — рад:*
*Здымаць ён будзе*
*не людзей,*
*А розных там*
*лясных... дзяўчат.*

І пры гэтым — ну вельмі старацца, бо зараз, дзякуючы знаходцы, апынуўся, можна сказаць у нейкім паўкроку ад новай цікавай работы, на думку **спадарыні Гудачковай**, цяпер прамаўляе:

*Хоць малы я,*
*ды вяртлявы —*
*Што не здымак —*
*то ўдалы!*
*Маю добры апарат...*
*Ну, вазьмі, «Звязда»,*
*у штат!*

Ёсць над чым падумаць, бо яно ж і сапраўды:

*Звер старанны,*
*вельмі жвавы —*
*Яму ўсё вакол цікава:*
*Дзе грыбы,*
*арэхі,*
*семкі?*
*«Аблятае» сосны-елкі,*
*Усё дамоў сабе цягае*
*І бязбедна пражывае...*
*Ён падобны —*
*ну, не іначай —*
*Да людзей,*
*што маюць дачы.*

Грэх не згадзіцца з **сужэнцамі Астроўскімі** і не працытаваць яшчэ два лісты:

«...Гляну на здымак, — піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, — і адразу прыгадаю эпізод з мультфільма пра насельнікаў Прастаквашына. Помніце: Шарык, якому падарылі фотаруўжо, скардзіўся, што ўвесь дзень бегаў за зайцам, каб сфатаграфаваць... На што кот Матроскін слушна заўважыў: «Цяпер ты будзеш дзень бегаць, каб фатаграфію аддаць».

У працяг — наступныя радкі:

*З фотастрэльбай*
*Шарык днямі*
*У лесе гойсаў за звярамі*
*І... нікога не дагнаў —*
*Толькі лапы пазбіваў.*
*Кот Матроскін даў параду:*
*«Лепей ты зрабі засаду.*
*Паглядзець*
*на «цуда-вока»*
*Прыбягуць*
*звяры здалёку».*

Гэта — як закон, бо яны і праўда вельмі цікаўныя, а галоўнае — ёсць... Як і заклік ад **спадарыні Гудачковай**:

*...Наталяцца каб красою*
*У лясах, а не на здымках,*
*Беражыце ўсё жывое:*
*Лік — пакуль —*
*не на адзінкі!*

Вось на гэтай кранальнай ноце і закончыць бы чарговы агляд. Але ж трэба падвесці вынікі, а значыць, нагадаць, што на мінулым здымку (гл. нумар «Звязды» за 24 студзеня) было красамоўна напярэджанне (сярод зімы): «Асцярожна! Праводзіцца касьба».

Найлепшыя радкі пра яе, паводле вялікага чытацкага журы, напісалі **спадарыня Любоў Чыгрынава** і **сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Аляксандр Матошка з Расоншчыны, Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка** і **Валерый Гаўрыш з Чавусаў**.

З гэтым, апошнім, меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае, таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на другі квартал 2024-га накіроўваецца ў Чавусы.

Хочацца, каб найстарэйшая і «родная газета на роднай мове» пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас, тады выраяўнтаў два: першы — своечасова аформіць падпіску, другі — уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс і...

Шанс на перамогу мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі на гэты раз строгага конкурснага адбору. Затое ў наступны...*
*Пішыце! Свет захаваўся, таму што смяяўся. І думаў.*

Круглы стол

# ДАРОСЛЫЯ ПЫТАННІ ДЛЯ НЕДАРОСЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

## Медыкі расказалі, як захаваць рэпрадуктыўнае здароўе падлеткаў

**Шмат у чым яно залежыць ад выхавання, духоўнага і інтэлектуальнага развіцця. Адказнае стаўленне да сябе, веды аб целе чалавека і кантрацэпцыі, простыя рэкамендацыі, якія нескладана выконваць нават падлетку, і ўвага бацькоў да свайго дзіцяці — вось бадай адны з галоўных складнікаў рэпрадуктыўнага здароўя. Пра захворванні, якія яго пагаршаюць, і іх прафілактыку, а таксама ролю бацькоў і прышчэпак падчас «круглага стала» «Звязда» паразмаўляла са старшым выкладчыкам кафедры рэпрадуктыўнага здароўя і медыцынскай генетыкі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Святланай КРЭЭР, урачом-акушэрам-гінеколагам РНПЦ «Маці і дзіця» Ірынай БЫКАВАЙ, урачом-акушэрам-гінеколагам РНПЦ «Маці і дзіця» Марыяй БУЛАТАВАЙ.**



**Святлана Крэер:** — Здаровыя дзеці — гэта наша будучыня, а як яны могуць нараджацца такімі, калі іх будучыя бацькі не могуць пахваліцца сваім рэпрадуктыўным здароўем? У сучасных падлеткаў яно, на жаль, пакідае жадаць лепшага.

***— Давайце напачатку вызначым, які ўзрост лічыцца падлеткавым.***

**Ірына Быкава:** — Паводле СААЗ, падлеткавы ўзрост з'яўляецца перыядам росту і развіцця чалавека, які ідзе пасля дзяцінства і доўжыцца да дасягнення сталага ўзросту, гэта значыць з 10 да 18 гадоў.

***— Што ўплывае на рэпрадуктыўнае здароўе падлеткаў?***

**Святлана Крэер:** — У навуковых колах ужо даўно праводзяцца розныя даследаванні па ўплыве фактараў на рэпрадуктыўнае здароўе падлеткаў. У ходзе шматгадовых назіранняў было вызначана некалькі іх груп. Па-першае, гэта сацыяльна-псіхалагічныя фактары — уплыў стрэсаў, нервовага напружання, пачуцця трывогі і страху. Нярэдка парушэнні ў рэпрадуктыўным здароўі, асабліва ў дзяўчынак, узнікаюць з-за высокіх вучэбных нагрузак.

Другая група фактараў — генетычныя, гэта найперш наяўнасць або адсутнасць мутацый у палавых клетках. І трэцяя група — экалагічная. На гэтыя фактары мы можам паўплываць менш за ўсё, ну калі толькі пераехаць у больш спрыяльны раён з пункту гледжання экалогіі.

Ранняе неўсвядомленае палавое жыццё ў падлеткавым узросце можа прывесці да неспрыяльных наступстваў. У шэрагу выпадкаў можа адбыцца сітуацыя, калі дзяўчынкі прыходзяць на аборт, а гэта не можа не паўплываць на іх рэпрадуктыўнае здароўе. Аборт прыводзіць да розных хвароб у палавой сістэме, парушэнняў менструальнага цыкла.

Бяда яшчэ ў тым, што моладзь пры першых сімптомах захворвання не спяшаецца да ўрача, спадзеючыся, што ўсё хутка само сабой нармалізуецца. Цяпер вялікая колькасць дзяцей ужо нараджаецца з пэўнымі паталогіямі, што тады казаць аб іх здароўі ва ўзросце, калі час абзаводзіцца сем'ямі?

Згодна са статыстычнымі данымі, да пачатку сямейнага жыцця практычна кожны другі мае хранічныя захворванні, якія могуць прама або ўскосна ўплываць на рэпрадуктыўнае здароўе чалавека. Менавіта таму апошнім часам гэтае пытанне так хвалюе не толькі медыцынскіх работнікаў, але і ўсё грамадства.

***— У чым канкрэтна праяўляецца праблема?***

**Ірына Быкава:** — Тое, што характарыстыка рэпрадуктыўнага здароўя ў апошнія гады вымушае жадаць лепшага, пацвердзіць любы ўрач. Гэта даказваюць наступныя факты. Большасць насельніцтва дзетароднага ўзросту пакутуе на розныя інфекцыйныя і запаленчыя захворванні. Рэзка пагаршаецца рэпрадуктыўнае здароўе як мужчын, так і жанчын. З кожным годам расце колькасць бясплодных шлюбаў.

Анкалогія становіцца бізуном нашага грамадства, прычым вялікая колькасць хворых належыць да маладога пакалення. Агульнавядомы факт, што вірус папіломы чалавека высокай канцэрагеннай рызыкі можа выклікаць рак шыйкі маткі. Але рак шыйкі маткі можна папярэдзіць — на сённяшні дзень з'яўляецца метадам першаснай прафілактыкі. Гардасіл, цервварыкс — сучасныя вакцыны, якія дазваляюць папярэдзіць захворванні, што выклікаюцца вірусам папіломы чалавека.

Якія яшчэ доказы патрэбныя, каб зразумець, што неабходна нешта рабіць, каб умацаваць і палепшыць рэпрадуктыўнае здароўе найперш падлеткаў і моладзі?

***— Аднак не толькі хваробы рэпрадуктыўнай сістэмы ўплываюць на здароўе і магчымасць у будучым мець дзяцей. Якія яшчэ хваробы ўплываюць на рэпрадуктыўную функцыю?***

**Марыя Булатава:** — Гэта вялікі пералік захворванняў. Першая група — інфекцыйныя хваробы. Сярод іх маюцца такія, якія могуць прыводзіць да бясплоддзя, напрыклад, ветраная воспа, свінка, асабліва ў хлопчыкаў. Пра венерычныя інфекцыі казаць наогул не прыходзіцца.

Другая група хвароб адносіцца да агульнасаматычных. Гэта праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай, ныркамі, печанню, цукровы дыябет. Справа ў тым, што яны могуць не толькі пагаршаць агульны стан арганізма, але і парушаць гарманальны фон, а гэта не можа не адбіцца на рэпрадуктыўным здароўі.

Яшчэ адна група — прыроджаныя захворванні. Многія ўрачы перакананыя, што ў большасці выпадкаў бясплоддзе бярэ свой пачатак з ранняга дзяцінства. Прычым гэта датычыцца як хлопчыкаў, так і дзяўчынак.

Немалаважны і прыём лекавых прэпаратаў. Некаторыя з іх аказваюць дастаткова моцны ўплыў на рэпрадуктыўную функцыю. Да такіх можна аднесці кортыкастэроіды, супрацьсутаргавыя лекі, антыдэпрэсанты, транквілізатары, нейралептыкі.

Вядома, у некаторых сітуацыях без гэтых прэпаратаў проста не абысціся, але заўсёды неабходна ацэньваць рызыку для здароўя, асабліва калі вы яшчэ збіраецеся мець дзяцей.

***— Якія ж умовы прафілактыкі і захавання здароўя?***

**Марыя Булатава:** — Калі ўважліва паглядзець рэкамендацыі, то ў іх няма нічога невыканальнага. Самае першае, што павінен ведаць любы падлетак, — ранняе палавое жыццё можа прывесці да незваротных змен з боку рэпрадуктыўнай сістэмы. Тут важна ўсведамляць, што сучасныя кантрацэптывы дазваляюць не дапусціць непажаданай цяжарнасці, і імі неабходна карыстацца. А любую цяжарнасць — планаваць.

Важна займацца прафілактыкай і лячэннем усіх захворванняў палавой сферы. У першую чаргу гэта датычыцца адэкватнага лячэння інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Прычым сёння неабавязкова звяртацца да ўрача ў паліклініцы. Гінеколагі працуюць і ў цэнтрах, сяброўскіх да падлеткаў. Часам дзяўчынцы псіхалагічна прасцей прыйсці менавіта туды.

Ну і агульныя рэкамендацыі: весці здаровы лад жыцця, няўхільна выконваць правілы асабістай гігіены, прычым гэта датычыцца не толькі дзяўчат, але і хлопцаў. Акрамя таго, умацоўваць свой імунітэт, старацца правільна харчавацца і не ўжываць прадукты, якія шкодзяць здароўю.

**Святлана Крэер:** — Правілы, якія цалкам пад сілу выконваць любому, але, на жаль, не ўсе пра гэта задумваюцца. А рэпрадуктыўнае здароўе падлеткаў абавязкова адаб'ецца на іх стане ў дарослым жыцці, на здароўі і дабрабыце іх дзяцей.

Прамы абавязак бацькоў — пастаянна адукоўваць дзяўчынак і хлопчыкаў у гэтых пытаннях. Размаўляць на такія тэмы з маладымі людзьмі, вядома, складана. У гэтым узросце бацькі перастаюць быць аўтарытэтам, любое іх слова падвяргаецца сумневу. Аднак варта не апускаць рукі, а спрабаваць знайсці патрэбныя словы для настаўлення. Калі пагаварыць не атрымоўваецца, варта звярнуцца да спецыяліста, які зможа знайсці агульную мову з падлеткам.

---

Карысна ведаць

# ЛЕКІ ПА БУДЗІЛЬНІКУ

## На якія прэпараты ўплывае прыём ежы?

**Апроч таго, што мы прымаем лекі па прызначэнні ўрача, мы жывём звычайным жыццём. Таму некаторыя прымаюць прэпарат не тады, калі трэба, а тады, калі ўспомняць. Тым больш мала хто ўлічвае, якія лекі трэба прымаць да прыёму ежы, якія — падчас ежы, а якія — толькі пасля яе. Наколькі строгія «харчовыя абмежаванні» і як яны ўплываюць на дзеянне лекаў?**



### Да, падчас ці пасля?

Час прыёму лекавага прэпарата залежыць ад яго прызначэння і лекавай формы (адны рассмоктваюцца ў страўніку, другія — у тонкім кішэчніку, трэція — у тоўстай кішцы). Да яды звычайна прымаюцца тыя прэпараты, дзеянне якіх можа прыгнятацца ежай, або тыя, якія прызначаны для найлепшага засваення прадуктаў харчавання. Пры гэтым варта ўстрымлівацца ад прыёму на галодны страўнік нестэроідных супрацьзапаленчых прэпаратаў, якія раздражняюць слізістую страўніка і могуць стаць прычынай язвы. Разам з ежай прымаюцца вітаміны і харчовыя дабаўкі, якія аказваюць дзеянне толькі ў спалучэнні з ежай. Пасля яды — прэпараты ад пякоткі і тыя, што палягчаюць пераўтраўліванне ежы.

Аднак строгія часовыя абмежаванні ў асноўным датычацца «старых» прэпаратаў. Большасць сучасных лекаў прымаецца незалежна ад ежы, паколькі іх лекавыя формы прызначаны для рассмоктвання ў патрэбнай частцы страўнікава-кішачнага тракту.

### Лепш днём

Лекавыя прэпараты могуць адрозніваецца па сваім уздзеянні на арганізм: напрыклад, некаторыя выклікаюць бяссонніцу ці іншыя пабочныя эфекты. Таму перад сном не варта прымаць:

**стымулятары ЦНС.** Прэпараты, такія як кафеін ці некаторыя лекі ад прастуды і алергіі, могуць стымуляваць цэнтральную нервовую сістэму, што прыводзіць да бяссонніцы. А тая цягне за сабой шмат розных цяжкіх праблем са здароўем;

**дыўрэтыкі.** Гэтыя прэпараты стымулююць мочаспусканне, таму іх прыём перад сном можа выклікаць частыя начныя пад'ёмы. Зноў жа будуць праблемы са сном з усімі вынікальнымі негатыўнымі нюансамі;

**прэпараты з алкаголем.** Некаторыя лекі змяшчаюць алкаголь, які можа парушаць фазы сну;

**прэпараты для пахудзення.**

### Ці ўсё ж такі нанач?

У той жа час ёсць прэпараты, якія рэкамендуецца прымаць менавіта перад сном. Да гэтай групы лекаў адносяцца:

**сродкі ад бяссонніцы**, абавязкова ўлічваючы дазіроўку і не перавышаючы рэкамендаваную ўрачом;

**прэпараты, якія павольна дзейнічаюць.** Некаторыя лекі, такія як статыны (прэпараты для зніжэння ўзроўню халестэрыну), часта рэкамендуецца прымаць нанач, бо яны могуць больш эфектыўна працаваць у начны час;

**лекі для расслаблення мышцаў.** Калі вам рэкамендавалі прэпараты для расслаблення мышцаў, іх лепш прымаць менавіта ў вячэрні час сутак, бо яны могуць выклікаць дрымотнасць.

Перад ужываннем любога лекавага сродку важна пракансультавацца з урачом. Ён сарыентуе і па дазіроўцы, і па працягласці прыёму, а таксама ў які час дня лепш за ўсё прымаць прэпарат. Не варта самастойна мяняць рэкамендаваны рэжым без кансультацыі са спецыялістам. Пабочныя эфекты могуць быць вельмі небяспечнымі і сур'ёзнымі.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, оф. 5. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», г. Минск, ул. Казинца, 4, к. 304. УНП 101187767 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов** – имущество, бывшее в употреблении

| Номер лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5516А5, рег. знак АР 2514-7,** 2008 г. в., инв. № 12073 | **33 360,00** |
| 2 | **Погрузчик МАЗ-МАН ВМЕ-1565, рег. знак КА-7 4679,** 2014 г. в., инв. № 12071 | **21 840,00** |

**Местонахождение:**
**лот № 1 – г. Минск, ул. Казинца 4,**
**лот № 2 – г. Минск, ул. Бабушкина, 24**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в бел. рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения торгов

**Предмет аукциона должен быть оплачен** покупателем в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты не более 400,00 бел. руб. на проведение торгов и оплатить установленное вознаграждение 1,5 % от цены продажи предмета аукциона в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.04.2024 с 11.00 до 12.00.**
